Пралетары, усіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 11 (3915)
Панядзелак, 12 студзеня 19[illegible] г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Новы судовы фарс у фашысцкай Польшчы

Калі тры гады таму назад у Вільні адбываўся вядомы працэс над «Беларускай Грамадой», польскі фашызм і ўсе яго падгалоскі ўрачыста абвясьцілі сьвету аб тым, што беларускі нацыянальна-вызваленчы рух ліквідаваны, што з камунізмам на крэсах скончана, што ў Зах. Беларусі ўстаноўлен цьвёрды парадак і спакой.

Калі Луцкевіч, Астроўскі і разам з імі буржуазная частка беларускай інтэлігенцыі стаяла на пазыцыі АДКРЫТАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА з Піл-судзкім—фашысцкая прэса гучна заяўляла, што ўсе «лепшыя» сілы беларускай інтэлігенцыі перайшлі на бок польскай фашысцкай дзяржаўнасьці.

Калі, нарэшце, два месяцы таму назад польскі фашызм сьвяткаваў сваю «перамогу» ў часе выбараў у сойм, ён трубіў аб тым, што ўвесь беларускі народ выказаў свае вернаподданіцкія пачуцьці да нагайкі Піл-судзкага і цапкам галасаваў за яго сьпіс.

І вось не пасьпеў высахнуць атрамант на пер'ях фашысцкіх нацыянал і сацыял-фашысцкіх борзапісцаў, якія ўзмоцнена раздувалі разьмеры палітычнай «перамогі» фашызму на З. Б., як у Вільні пачаўся новы судовы фарс, гэтым разам, над рабоча-сялянскімі паслямі беларускага соймавага клюбу «Змаганьне» і групай беларускіх рабочых і сялян.

Віленскі працэс над беларускім клюбам «Змаганьне» — падзея выключнай палітычнай важнасьці і значэньня. Для савецкай грамадзянскасьці было ясна, што наперакор казённым аптымістычным заявам акупанцкіх правіцеляй аб «спакоі» на З. Б., класавае змаганьне ў З. Б. за ўсе апошнія гады ня толькі ня сьціхала, але абвастралася і паглыблялася. «Перамога» браніванага кулака фашысцкай дыктатуры над Грамадой, зразумела, не ліквідавала тых глыбокіх сацыяльных супярэчнасьцяй, якія ёсьць у Зах. Беларусі, а, наадварот, яна іх паглыбіла.

Працэс, які зараз адбываецца ў Вільні над арганізацыямі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, пацьвярджае з усёй выразнасьцю і пераканаўчасьцю гэты асноўны факт, факт бурнага рэвалюцыйнага ўздыму, які нарастае ў Зах. Беларусі таксама, як і ва ўсёй Польшчы. Колькі-б ня крычалі фашысьцкія газэты аб пануючай у масах апатыі, аб тым, што сярод працоўных Зах. Беларусі наглядаецца зрух у бок «грамадзянскага міру» і мірнага супрацоўніцтва з акупантамі — рэвалюцыйнае змаганьне, пад кіраўніцтвам нашай брацкай КПЗБ, расьце. Лепшым паказьвіцелем росту актыўнасьці мас, росту і абвастрэньня нацыянальна-вызваленчага руху зьяўляецца гэты чарговы працэс.

Той эканамічны крызіс, які ахапіў усю Польшчу, адбіваецца на становішчы Зах. Беларусі са значна большай сілай, чым у іншых частках краю. Яшчэ ніколі за ўсе гады польскай акупацыі не назіралася такога катастрафічнага гаспадарчага становішча, якое мы бачым зараз на той бок кардону. Яшчэ ніколі не ўзрастала такімі тэмпамі галеча і голад сярод мільённых мас рабочае вёскі і сялянства Зах. Беларусі. Гэты крызіс, які ідзе чага ў нагу з нябачным яшчэ абвастрэньнем белага тэрору і нацыянальнага ўціску — робіць сваю рэвалюцыянізуючую справу. Працоўныя масы ўсё больш пераконваюцца ў тым, што той шлях, на які заклікае іх стаць камуністычная партыя, ШЛЯХ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЫРАШЭНЬНЯ КРЫЗІСУ, зьяўляецца адзіна верным выхадам з голаду, тэрору і галечы.

І, зразумела, што проста зусім глупымі зьяўляюцца байкі аб тым, што быццам-бы міфічная «рука Масквы» і «рука Менску» зьяўляецца арганізатарам рэвалюцыйных выступленьняў працоўных Зах. Беларусі. А гэтыя байкі з надзвычайнай антыўнасьцю зноў і зноў паўтараю ўся польская прэса ў сувязі з працэсам над беларускім клюбам «Змаганьне», які пачаўся ў Вільні. Тав. Сталін яшчэ на XVI зьезьдзе УсеКП(б) выразна адказаў на ўсе гэтыя легенды, якія пры ўсякім выпадку распаўсюджваюцца нашымі ворагамі, «Як могуць людзі, — гаварыў т. Сталін, — якія не хочуць быць сьмешнымі, «адгараджвацца» ад ідэй бальшавізму, калі ў самой краіне ёсьць грунт, спрыяючы гэтым ідэям? Царызм таксама «адгараджваўся» ў свой час ад бальшавізму, але не «адгарадзіўся», як вядома. Не адгарадзіўся, бо бальшавізм расьце ўсюды, ня звонку, але знутры... Вось, калі-б паны капіталісты маглі як-небудзь «адгарадзіцца» ад эканамічнага крызісу, ад галечы мас, ад беспрацоўя, ад нізкай заработнай платы, ад эксплёватацыі працоўных, тады іншая справа, тады ня было-б у іх і бальшавіцкага руху. Але ў тым-та і справа, што ўсякі прахвост імкнецца апраўдаць сваю слабасьць або сваю нядольнасьць спасыланьнем на прапаганду рускіх бальшавікоў»...

Рэвалюцыйныя настроі растуць у масах, бо яны жывяцца сіламі, якія насьпяваюць у самой Польшчы і Зах. Беларусі з нячуванай хуткасьцю. Польскі фашызм ня ў стане ліквідаваць таго грунту, на якім расьце і будзе абвастрацца, ня гледзячы ні на яні тэрор, рэвалюцыйнае змаганьне мас.

Віленскі працэс — гэта яшчэ адзін яркі довад таго, чаго варты легенды аб вялікіх «перамогах» Піл-судзкага ў часе перавыбараў у сойм. Тут нешта не ў парадку ў паноў фашыстаў! З аднаго боку — нібы-та буйныя перамогі, з другога — працэс над беларускімі нацыянальна-вызваленчымі арганізацыямі, МАСАВЫ ХАРАКТАР ЯКІХ прымушана прызнаваць навет сама афіцыйная польская прэса.

Працэс у Вільні — гэта довад абанкрутваньня нацыянальнай палітыкі Піл-судзкага ў Зах. Беларусі, якая выходзіла і выходзіць перш за ўсё з ваенных матаў польскага імпэрыялізму і імкненьняў дэзарганізаваць і разьбіць нацыянальна-вызваленчы рух. ПОЛЬСКАМУ ФАШЫЗМУ НЕ ЎДАЛОСЯ РАЗЬБІЦЬ ГЭТАГА РУХУ. Не ўдалося падпарадкаваць нацыянальна-вызваленчага руху і ўплывам беларускай буржуазіі і яе прадстаўнікоў беларускіх нацыянал-фашыстаў, на падтрыманьне якіх акупанты кідаюць нямала сіл і грашовых сродкаў.

Клясавая барацьба ўшчэнт разьбіла спробы беларускай контр-рэвалюцыі ўзяць у свае рукі кіраўніцтва шырокімі масамі. Працоўныя не пайшлі за Луцкевічам і цьвёрда змагаюцца ПАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ СЬЦЯГАМІ КПЗБ, РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ ЛЁЗУНГАМІ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ.

Працэс гаворыць за тое, што лепшая частка беларускай працоўнай інтэлігенцыі, зьвязаная з працоўнымі масамі, знаходзіцца ў баку рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных мас.

У нацыянальна-вызваленчым руху ўсё больш абвастраюцца сацыяльна-клясавыя моманты, ён усё больш кансалідуецца ў бабу з акупантамі і беларускім нацыянал-фашызмам.

Працэс — гэта судовая камэдыя, яная разыгрываецца ў Вільні — выкрывае тэрор фашысцкай улады над З. Б. Абвінаваўчы акт складзен на падставе самых гнусных і беспардонных правакацыйных выдумак і хлусьні. Сьведкі, якія выступаюць на працэсе, — ГЭТА ВЫКЛЮЧНА камісары палітычнай паліцыі, паліцэйскія і канфідэнты. Усе яны, адзін за адным, дакладваюць суду аб «вялізарных злачынствах», якія выяўляліся ў пасольскіх мітынгах, у рабоце культурнай арганізацыі ТБШ (Таварыства Беларускай школы), у стварэньні камітэту дапамогі галадзючым сялянам, у распаўсюджаньні беларускіх кніг і часопісяў. Сярод цяжкіх «злачынстваў» супроць польскай дзяржаўнасьці фігуруе і такі сымбалічны факт, як тое, што быццам-бы паліцыя знайшла ў часе абшуку ў Цэнтральным Сакратарыяце Беларускага клюбу «Змаганьне» плякаты аб... ПЯЦІГОДЦЫ. Мы разумеем, чаму плякаты і адозвы, якія тлумачаць масам 3. Б. сутнасьць таго, што робіцца ў БССР прыводзіць у такое шаленства і злосьць паноў акупантаў. Пяцігодка хвалюе ворагаў. Пяцігодка рэвалюцыянізуе масы Зах. Беларусі і Польшчы і таму яе папулярызацыя — гэта «вялікае злачынства» супроць фашысцкай дыктатуры голаду, тэрору і вайны.

Віленскі працэс адбываецца якраз у той час, калі кампанія ўсяго польскага друку супроць нашай пяцігодкі сьведчыць аб тым, што польскі імпэрыялізм ЛІХАМАНКАВА ІМКНЕЦЦА ЗАКОНЧЫЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ІНТЭРВЕНЦЫІ СУПРОЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ. Віленскі працэс — гэта адно са зьвеньняў у ланцугу падрыхтоўчых работ да вайны. І таму невыпадкова, што на самым працэсе фігуруе і пяцігодка і легендарная «рука Масквы», г. зн. усё тое, што складае зьвычайны арсэнал пакалёніцкіх кампаній супроць СССР. Працоўныя масы Савецкай Беларусі расцэньваюць гэты працэс, як новы довад росту ваеннай агрэсыўнасьці польскага імпэрыялізму.

Віленскі працэс зьяўляецца таксама і лепшым адказам беларускім нацыянал-дэмакратам тут у нас, у БССР, і лепшай ілюстрацыяй да тэй кампаніі супроць БССР, якую разгарнула за апошні час уся фашысцкая і беларуская нацыянал-фашысцкая прэса ў Польшчы.

Беларускія нацыянал-дэмакраты ў сваёй контр-рэвалюцыйнай рабоце імкнуліся да таго, каб польская дэфэнзыва, фашысцкі суд і акупанцкая турма былі гаспадарамі ня толькі ў Заходняй Беларусі, але і тут у нас, у БССР. Яны працавалі над тым, каб пры дапамозе інтэрвэнтаў зваліць савецкую ўладу і ўстанавіць тут рэжым паліцэйскага разгулу, рэжым дэфэнзывы і віленскіх працэсаў і цансі нацыянальнага ўціску аднавіць капіталістычную ўласнасьць і ўладу. Беларускія нацыянал-дэмакраты з надзеяй паглядаюць на капіталістычны Захад, бачачы ў ім ідэалы сваіх нацыяналістычных контр-рэвалюцыйных пятуценьняў. І вось якраз зараз на гэтым Захадзе, у Вільні мы бачым падзеі, якія яркімі фарбамі малююць карціну таго, чаго дабіваліся беларускія нацыянал-дэмакраты тут, у БССР, і што так старанна расхвальваюць польскія фашысты і беларускія нацыянал-фашысты. Зусім відавочна, што ніякіх пакалёніцкіх вымыслаў фашысцкай і нацыянал-фашысцкай прэсы ў сувязі з разгромам контр-рэвалюцыйнай групкі нацыянал-дэмакратаў ня здолеюць захаваць тае найгыдэйшае бездані, якая аддзяляла становішча вольных рабочых і працоўных сялян БССР ад становішча іх стогнучых пад ботам фашысцкай дыктатуры братоў па клясе ў Зах. Беларусі.

Віленскім працэсам і дзесяткамі яму падобных працэсаў фашысцкая дыктатура хоча задушыць сілы рэвалюцыі і гэтым самым адцягнуць час тэй няўхільнай гістарычнай расплаты, да якой ядуць усё больш нарастаючыя супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы. А гэты час надыходзіць з няўмольнай шпаркасьцю. Над гэтым працуюць усе сілы гісторыі. І нішто ня стрымае разьвіцьця клясавай барацьбы і росту рэвалюцыйных уплываў у масах працоўных Зах. Беларусі і Польшчы, якія ідуць пад кіраўніцтвам сваіх кампартый да рашучых баёў з фашысцкай дыктатурай.

Магутным пратэстам супроць фашысцкіх распраў над працоўнымі Зах. Беларусі рабочыя і сяляне БССР выкажуць сваю рэвалюцыйную салідарнасьць з рэвалюцыйнай барацьбой працоўных Зах. Беларусі і Польшчы.

III сэсія ЦВК СССР закрылася

„Кожная новая перамога ў галіне арганізацыі працы зьяўляецца аднэй з вялікіх перамог іменна ў сацыялістычным будаўніцтве“

(З заключнай прамовы тав. Калініна)

Таварышы! Зацьвярджэньнем народна - гаспадарчага пляну і саюзнага бюджэту мы завяршылі вялізарную плянавую работу, якая прапягвалася рад месяцаў. Хаця плян у цэлым і ў дэталях вельмі яркa быў асьветлены ў дакладах і ў прамовах членаў ЦВК, я таксама давялю сабе спыніцца на адным з элемэнтаў, што адасьпца, на асноўным элемэнце гэтага пляну, а іменна: **на пытаньні аб рабочай сіле.** Гэта невыпадкова, што на парадак дня гэтай сэсіі мы паставілі іменна пытаньне аб рабочай сіле. Бо яшчэ-ж параўнаўча так нядаўна былі заняты пытаньнем аб тым, як зжыць беспрацоўе. А зараз перад намі стаіць пытаньне як перамагчы недахват рабочай сілы.

Калі мы цяпер хочам ведаць адкуль атрымаўся гэты недахват рабочай сілы, у чым заключаецца прычына нябывалага на ўсім сьвеце зьявішча, якое разгортваецца перад Савецкім Саюзам, дык мы павінны констатаваць, што гэта ёсьць перш за ўсё рэзультат вялізарных вытворчых дасягненьняў Савецкага Саюзу. Падумайце толькі: **уцягнуць мільённыя беспрацоўныя масы ў вытворчы працэс.** Гэта гаворыць аб тым, што мы параўнаўча далёка пайшлі наперад у галіне наладжваньня вытворчасьці, у галіне ўцягваньня новых рабочых у гэту вытворчасьць.

І з другога боку — мы ня ведаем, што ў значнай ступені недахват рабочай сілы тлумачыцца і слабым скарыстаньнем, кепскай ае арганізаванасьцю. Такім чынам, мы бачыце, з аднаго боку, дадатны паказальнік: вырасла наша вытворчасьць, вырасла настолькі, што патлумачыла ўсе беспрацоўныя масы; з другога боку, бясспрэчна, гэта бясспорная колькасьць фактаў, якія гавораць, што ў нашым вытворчым апараце яшчэ знаходзяцца значныя лішкі кадры, якія пры лепшай арганізаванасьці, пры ўмелым разьмеркаваньні павінны былі б ліквідаваць недахват у рабочай сіле. І зараз перад органамі Наркампрацы і наогул перад органамі савецкай улады паўстала неабходнасьць лепшага пляніраваньня рабочай сілы, больш матэзгоднага яе разьмеркаваньня. Гэта робіцца літаральна пільнай задачай самой вытворчасьці. Адсюль зусім відавочна, што і роля народнага камісарыяту працы ў вельмі значнай ступені павышаецца. Як толькі выяўіўся недахват рабочай сілы, з гэтага моманту народны камісарыят працы з органу рэгістрэвучага, які насылае на работу і сочыць за аховай працы, ператвараўся ў орган арганізацыі працы. Таварышы, маленькае дачыненьне з галіною вытворчасьці наогул і прамысловасьці ў прыватнасьці паказвае нам, што прадукцыйнасьць працы да сёньняшта для нас важыць ня толькі ад тэхнікі, а, балам, у рашаючай ступені яна залежыць іменна ад правільнай арганізацыі рабочай сілы. Усе абсьледаваньні фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў паказваюць, што там, дзе хоць крыху налажана арганізацыя працы, там эфэктыўнасьць працы пры адным і тым-жа тэхнічным стаіць далёка вышэй. Таму зараз пытаньні арганізацыі і разьмеркаваньня рабочай сілы набываюць асаблівае значэньне.

Зараз, на сутнасьці кажучы, мы ня ведаем разгорнутае будаўніцтва сацыялізму. Што гэта значыць? Гэта значыць, што мы сьвядома, пляномерна, матэзгодна разьмяшчаем і перамяшчаем вытворчыя сілы. Тут сутнасьць сацыялістычнага будаўніцтва выяўляецца ня толькі ў тым, што мы пабудуем гіганты. Гэта робіць яшчэ і буржуазны лад. Як-бы ня былі вялікія нашы гіганты, яны або роўныя заграничным, або крыху вышэй, а ў агульным і палым яны жадаюць яшчэ шмат лепшага і, галоўным чынам, у адносінах больш арганізаванага і матэзгоднага скарыстаньня рабочай сілы. Вось гэта арганізаванае скарыстаньне наўгай рабочай сілы, яе найбольш матэзгоднае разьмеркаваньне ў грамадзкім маштабе, улік усіх тых спэцыфічных асаблівасьцяй, якія мае гэта сіла (я маю на ўвазе прыстасаваньне жаночае працы, прыстасаваньне працы моладзі і г. д.) — усё гэта набывае вялізарнае значэньне. Тут перад намі ў бліжэйшым будучым паўстане задача ўжываць жаночую працу там, дзе гэта будзе лягчэй за ўсё жанчынам. Яны павінны быць пастаўлены ў такія ўмовы, каб работа ня шкодзіла іх адарою. Мы паставілі пытаньне аб уцягваньні моладзі ў работу. Яе мы павінны разглядаць з двух бакоў. З аднаго боку, гэта — непасрэдная рабочая сіла, якая ўваходзіць у вытворчасьць. З другога боку, гэта — рабочая сіла, якая павінна **кваліфікавацца і ўдасканальвацца,** з якой павінны потым выходзіць высокакваліфікаваныя спэцыялісты і рабочыя. Адным словам, таварышы, перад намі стаіць труднейшы задачы у галіне разьмяшчэньня, найбольш матэзгоднага і пляномернага разьмеркаваньня рабочай сілы. Але гэта, таварышы, толькі адзін бок задачы.

Другі бок задачы — гэта паляпшэньне кваліфікацыі і ўзьвышэньне вытворчай эфэктыўнасьці рабочай сілы. Мы добра разумоем, што з кожным годам новыя папаўненьні рабочай сілы будуць адносна меншыя у той час, як размах нашага будаўніцтва павялічваецца, патрэбнасьці рабочай класы растуць. Таму недахват рабочай сілы будзе алчыцца. Такім чынам мы будзем змагацца з гэтым недахватам. Паміма лепшага, больш пляніраванага разьмеркаваньня рабочай сілы па раёнах і па вытворчасьцях, — паміма ўсяго гэтага мы яшчэ павінны ўзьняць кваліфікацыю рабочых. Там, дзе раней працавала пяць рабочых, цяпер гэты працэс павінен абсаўжыць адзін рабочы. Мы павінны ўзьняць кваліфікацыю, пачынаючы з высокакваліфікаваных рабочых і канчаючы рабочымі самае простае працы. У нашай прамысловасьці, калі мы прааналізуем найбольш слабыя яе месцы, дык убачым, што найменшая эфэктыўнасьць работы атрымліваецца іменна ў катэгорыі простых рабочых і рабочых абсалютуўваючых, якіх у нас далёка больш, чым у Заходняй Эўропе. Таму я і гавару, што другі бок задачы, якая стаіць перад намі, гэта — **узьняцьце кваліфікацыі рабочых, а разам з тым, бясспрэчна, і ўзьняцьце культурнага ўзроўню рабочых,** бо нават самая простая чалавечая праца патрабуе пісьменнасьці і некаторай адукацыі. Адным словам, таварышы, падагульваючы вынікі, мы можам сьмела сказаць, што зараз **эфэктыўнасьць вытворчасьці ўніраецца ў нашы арганізацыйныя недахопы.** Сацыялістычная вытворчасьць патрабуе дасканаласьці арганізацыі, і на гэта неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу. І, таварышы, кожная новая перамога ў галіне арганізацыі працы, мне здаецца, ёсьць адна з вялікіх перамог іменна ў сацыялістычным будаўніцтве.

Таварышы, мне хацелася-б спыніцца яшчэ на адным пытаньні. У замежным друку зараз ідзе «свістопляска» аб «савецкім дэмпінгу» і аб тым, што нашы тавары вырабляюцца, нібыта, прымусовай працай. Нашы ворагі прабуюць прадставіць у відзе прымусовае працы перш за ўсё нашы дасягненьні ў плянавым разьмеркаваньні рабочай сілы, хаця гэтыя дасягненьні, на праўдзе кажучы, вельмі невялікія. Мы робім яшчэ толькі першыя крокі ў галіне мэтазгоднага разьмеркаваньня, у галіне пляніраваньня рабочай сілы. І, аднак, таварышы, **першыя нашы гэтыя дасягненьні ў галіне мэтазгоднага разьмеркаваньня рабочай сілы, як і калектывізацыі ў вёсцы, у замежным друку літаральна сплканы ў штыхі.** Буржуазія пранільна клясавым інстынктам схватае вялізарнае значэньне гэтых першых посьпехаў. Калі зьмерыць нашы дасягненьні і ацаніць важнасьць гэтых дасягненьняў, дык трэба проста сказаць, што найбольш важныя дасягненьні ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва — гэта **калектывізацыя і пляннавае разьмеркаваньне рабочай сілы.** Эфэктыўнасьць гэтага пляніраваньня, эфэктыўнасьць гэтага мэтазгоднага разьмеркаваньня ў бліжэйшым будучым пакажа ўвесь свой дадатны бок. Тое, што нашы ворагі апаганьваюць, пускаючы ў ход недарэчныя гутаркі аб «прымусовасьці», гэта ёсьць сапраўдны посьпех сацыялізму ў галіне арганізацыі працы, гэта ёсьць выкаханьне праграмы нашай партыі, у якой гаворыцца: «Неабходнае ў мэтах пляномернага разьвіцьця народнае гаспадаркі максымальнае скарыстаньне ўсёй наяўнай у дзяржаве рабочай сілы, яе правільнае разьмеркаваньне і пераразьмеркаваньне як паміж раённымі тэрытарыяльнымі галінамі, так і паміж розьнымі галінамі народнае гаспадаркі павінны паставіць у бліжэйшую задачу гаспадарчай палітыкі савецкай улады, якая можа быць ажыцьцёўлена ёю толькі ў цесным адзінстве з прафэсыянальнымі саюзамі». Бо сьмешна-ж гаварыць аб «прымусовасьці» ў краіне, дзе 98,2 проц. народнага даходу ідзе на працоўных, у той час, як у Амэрыцы на долю працоўных прыпадае толькі 54 проц. Тая «свістопляска», якая ідзе вакол ««савецкага дэмпінгу» і вакол тібыцта прымусовае працы, — гэта «свістопляска» ёсьць жаданьне засыпаць пылам вочы рабочае класы. Усё гэта прадстаўляе сабою нікчэмную спробу скінуць сваю віну за эканамічны крызіс з хворай галавы на здаровую.

І сапраўды, давайце разьбярэмся ў пытаньні аб «дэмпінгу» з пункту гледжаньня здаровага чалавечага сэнсу. Кажуць, што мы сваім вывазам імкнемся разбурыць капіталістычны сьвет. І характэрна, што капіталісты заўсёды процістаўляць увесь капіталістычны сьвет Савецкаму Саюзу. Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Ну, а скажаце, калі ласка, хіба-ж гэта не пакажаецца нашымі пакупкамі? Бо на тую-ж агульную суму, якую мы атрымліваем ад свайго продажу за граніцу, на гэту-ж суму мы і купляем заграничных тавараў. Калі наш продаж у мінулым годзе раўняўся 900 млн. руб., дык якраз на гэту-ж суму мы і купілі заграничных тавараў. Нашэ Савецкі Саюз ні аднэй унцыі золата ня вывез з-за граніцы.

Нарэшце, давайце аголім гэта пытаньне, пытаньне ўзаемнага тавараабароту. Што мы вывозім за граніцу? У асноўным, таварышы, **мы прадаем лес, нафту, футру, марганцавую руду і, параўнальна з даваенным часам, нязначную колькасьць збожжа.** Таварышы, кожны згодзіцца, што ў гэтых таварах заключаецца больш простая праца, чым у тых таварах, якія мы купляем за граніцай.

А якую прадукцыю мы атрымліваем з-за граніцы? У першую чаргу **машыны і абсталяваньне.** Вы самі разумееце, што гэта якраз тыя прадукты, у якія ў цяперашні час укладаецца максымальная колькасьць працы. Капіталісты сьпіньвяджаюць, што мы зьяўляемся вінаватымі ў крызісе. Але ўсякі згодзіцца, што мы, напрыклад, ні аднаго аўтамабіля ня толькі ўласнай работы, але і купленых за граніцай раней крызісу ня вывезлі па-за межы Саюзу. Наадварот, мы ў гэтым годзе больш купілі, чым у папярэднія гады. Аднак іменна ў гэтай галіне прамысловасьці заўважаецца найбольшы крызіс за граніцай. Мы вышэйшае каляровыя мэталі, каўчук і іншае, вывозім тыя прадукты, якія асабліва працаёмкія і ў галіне вытворчасьці якіх асабліва моцна разьвіты крызіс. Як-жа можна пасьля гэтага ўводзіць у зман літаральна ўгесь сьвет, заяўляючы, што наш гандаль пагаўляе крызіс у капіталістычных краінах, што мы зьяўляемся галоўнымі вінаватымі ў гэтым крызісе? Капіталісты шукаюць вінаватых. Але калі тут шукаць вінаватых, дык капіталісты ў Еўропе, а ня ў Савецкім Саюзе. Калі ў Еўропе ня будзе капіталістычных адносінаў, калі ў Еўропе ня будзе капіталістычнага ладу, то ніякіх крызісаў, ні эканамічных, ні палітычных, ні ваенных, ні ніякіх іншых, ня будзе. Вось, таварышы, у чым заключаецца прычына нябывалага на ўсім сьвеце зьявішча, якое разгортваецца перад Савецкім Саюзам, дык мы павінны констатаваць, што гэта ёсьць перш за ўсё рэзультат вялізарных вытворчых дасягненьняў Савецкага Саюзу. Падумайце толькі: **уцягнуць мільённыя беспрацоўныя масы ў вытворчы працэс.** Гэта гаворыць аб тым, што мы параўнаўча далёка пайшлі наперад у галіне наладжваньня вытворчасьці, у галіне ўцягваньня новых рабочых у гэту вытворчасьць.

І з другога боку — мы ня ведаем, што ў значнай ступені недахват рабочай сілы тлумачыцца і слабым скарыстаньнем, кепскай ае арганізаванасьцю. Такім чынам, мы бачыце, з аднаго боку, дадатны паказальнік: вырасла наша вытворчасьць, вырасла настолькі, што тлумачыла ўсе беспрацоўныя масы; з другога боку, бясспрэчна, гэта бясспорная колькасьць фактаў, якія гавораць, што ў нашым вытворчым апараце яшчэ знаходзяцца значныя лішкі кадры, якія пры лепшай арганізаванасьці, пры ўмелым разьмеркаваньні павінны былі б ліквідаваць недахват у рабочай сіле. І зараз перад органамі Наркампрацы і наогул перад органамі савецкай улады паўстала неабходнасьць лепшага пляніраваньня рабочай сілы, больш матэзгоднага яе разьмеркаваньня. Гэта робіцца літаральна пільнай задачай самой вытворчасьці. Адсюль зусім відавочна, што і роля народнага камісарыяту працы ў вельмі значнай ступені павышаецца. Як толькі выяўіўся недахват рабочай сілы, з гэтага моманту народны камісарыят працы з органу рэгістрэвучага, які насылае на работу і сочыць за аховай працы, ператвараўся ў орган арганізацыі працы. Таварышы, маленькае дачыненьне з галіною вытворчасьці наогул і прамысловасьці ў прыватнасьці паказвае нам, што прадукцыйнасьць працы да сёньняшта для нас важыць ня толькі ад тэхнікі, а, балам, у рашаючай ступені яна залежыць іменна ад правільнай арганізацыі рабочай сілы. Усе абсьледаваньні фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў паказваюць, што там, дзе хоць крыху налажана арганізацыя працы, там эфэктыўнасьць працы пры адным і тым-жа тэхнічным стаіць далёка вышэй. Таму зараз пытаньні арганізацыі і разьмеркаваньня рабочай сілы набываюць асаблівае значэньне.

Зараз, на сутнасьці кажучы, мы ня ведаем разгорнутае будаўніцтва сацыялізму. Што гэта значыць? Гэта значыць, што мы сьвядома, пляномерна, матэзгодна разьмяшчаем і перамяшчаем вытворчыя сілы. Тут сутнасьць сацыялістычнага будаўніцтва выяўляецца ня толькі ў тым, што мы пабудуем гіганты. Гэта робіць яшчэ і буржуазны лад. Як-бы ня былі вялікія нашы гіганты, яны або роўныя заграничным, або крыху вышэй, а ў агульным і палым яны жадаюць яшчэ шмат лепшага і, галоўным чынам, у адносінах больш арганізаванага і матэзгоднага скарыстаньня рабочай сілы. Вось гэта арганізаванае скарыстаньне наўгай рабочай сілы, яе найбольш матэзгоднае разьмеркаваньне ў грамадзкім маштабе, улік усіх тых спэцыфічных асаблівасьцяй, якія мае гэта сіла (я маю на ўвазе прыстасаваньне жаночае працы, прыстасаваньне працы моладзі і г. д.) — усё гэта набывае вялізарнае значэньне. Тут перад намі ў бліжэйшым будучым паўстане задача ўжываць жаночую працу там, дзе гэта будзе лягчэй за ўсё жанчынам. Яны павінны быць пастаўлены ў такія ўмовы, каб работа ня шкодзіла іх адарою. Мы паставілі пытаньне аб уцягваньні моладзі ў работу. Яе мы павінны разглядаць з двух бакоў. З аднаго боку, гэта — непасрэдная рабочая сіла, якая ўваходзіць у вытворчасьць. З другога боку, гэта — рабочая сіла, якая павінна **кваліфікавацца і ўдасканальвацца,** з якой павінны потым выходзіць высокакваліфікаваныя спэцыялісты і рабочыя. Адным словам, таварышы, перад намі стаіць труднейшы задачы у галіне разьмяшчэньня, найбольш матэзгоднага і пляномернага разьмеркаваньня рабочай сілы. Але гэта, таварышы, толькі адзін бок задачы.

Другі бок задачы — гэта паляпшэньне кваліфікацыі і ўзьвышэньне вытворчай эфэктыўнасьці рабочай сілы. Мы добра разумоем, што з кожным годам новыя папаўненьні рабочай сілы будуць адносна меншыя у той час, як размах нашага будаўніцтва павялічваецца, патрэбнасьці рабочай класы растуць. Таму недахват рабочай сілы будзе алчыцца. Такім чынам мы будзем змагацца з гэтым недахватам. Паміма лепшага, больш пляніраванага разьмеркаваньня рабочай сілы па раёнах і па вытворчасьцях, — паміма ўсяго гэтага мы яшчэ павінны ўзьняць кваліфікацыю рабочых. Там, дзе раней працавала пяць рабочых, цяпер гэты працэс павінен абсаўжыць адзін рабочы. Мы павінны ўзьняць кваліфікацыю, пачынаючы з высокакваліфікаваных рабочых і канчаючы рабочымі самае простае працы. У нашай прамысловасьці, калі мы прааналізуем найбольш слабыя яе месцы, дык убачым, што найменшая эфэктыўнасьць работы атрымліваецца іменна ў катэгорыі простых рабочых і рабочых абсалютуўваючых, якіх у нас далёка больш, чым у Заходняй Эўропе. Таму я і гавару, што другі бок задачы, якая стаіць перад намі, гэта — **узьняцьце кваліфікацыі рабочых, а разам з тым, бясспрэчна, і ўзьняцьце культурнага ўзроўню рабочых,** бо нават самая простая чалавечая праца патрабуе пісьменнасьці і некаторай адукацыі. Адным словам, таварышы, падагульваючы вынікі, мы можам сьмела сказаць, што зараз **эфэктыўнасьць вытворчасьці ўніраецца ў нашы арганізацыйныя недахопы.** Сацыялістычная вытворчасьць патрабуе дасканаласьці арганізацыі, і на гэта неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу. І, таварышы, кожная новая перамога ў галіне арганізацыі працы, мне здаецца, ёсьць адна з вялікіх перамог іменна ў сацыялістычным будаўніцтве.

Таварышы, мне хацелася-б спыніцца яшчэ на адным пытаньні. У замежным друку зараз ідзе «свістопляска» аб «савецкім дэмпінгу» і аб тым, што нашы тавары вырабляюцца, нібыта, прымусовай працай. Нашы ворагі прабуюць прадставіць у відзе прымусовае працы перш за ўсё нашы дасягненьні ў плянавым разьмеркаваньні рабочай сілы, хаця гэтыя дасягненьні, на праўдзе кажучы, вельмі невялікія. Мы робім яшчэ толькі першыя крокі ў галіне мэтазгоднага разьмеркаваньня, у галіне пляніраваньня рабочай сілы. І, аднак, таварышы, **першыя нашы гэтыя дасягненьні ў галіне мэтазгоднага разьмеркаваньня рабочай сілы, як і калектывізацыі ў вёсцы, у замежным друку літаральна сплканы ў штыхі.** Буржуазія пранільна клясавым інстынктам схватае вялізарнае значэньне гэтых першых посьпехаў. Калі зьмерыць нашы дасягненьні і ацаніць важнасьць гэтых дасягненьняў, дык трэба проста сказаць, што найбольш важныя дасягненьні ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва — гэта **калектывізацыя і пляннавае разьмеркаваньне рабочай сілы.** Эфэктыўнасьць гэтага пляніраваньня, эфэктыўнасьць гэтага мэтазгоднага разьмеркаваньня ў бліжэйшым будучым паказа ўвесь свой дадатны бок. Тое, што нашы ворагі апаганьваюць, пускаючы ў ход недарэчныя гутаркі аб «прымусовасьці», гэта ёсьць сапраўдны посьпех сацыялізму ў галіне арганізацыі працы, гэта ёсьць выкаханьне праграмы нашай партыі, у якой гаворыцца: «Неабходнае ў мэтах пляномернага разьвіцьця народнае гаспадаркі максымальнае скарыстаньне ўсёй наяўнай у дзяржаве рабочай сілы, яе правільнае разьмеркаваньне і пераразьмеркаваньне як паміж раённымі тэрытарыяльнымі галінамі, так і паміж розьнымі галінамі народнае гаспадаркі павінны паставіць у бліжэйшую задачу гаспадарчай палітыкі савецкай улады, якая можа быць ажыцьцёўлена ёю толькі ў цесным адзінстве з прафэсыянальнымі саюзамі». Бо сьмешна-ж гаварыць аб «прымусовасьці» ў краіне, дзе 98,2 проц. народнага даходу ідзе на працоўных, у той час, як у Амэрыцы на долю працоўных прыпадае толькі 54 проц. Тая «свістопляска», якая ідзе вакол ««савецкага дэмпінгу» і вакол тібыцта прымусовае працы, — гэта «свістопляска» ёсьць жаданьне засыпаць пылам вочы рабочае класы. Усё гэта прадстаўляе сабою нікчэмную спробу скінуць сваю віну за эканамічны крызіс з хворай галавы на здаровую.

І сапраўды, давайце разьбярэмся ў пытаньні аб «дэмпінгу» з пункту гледжаньня здаровага чалавечага сэнсу. Кажуць, што мы сваім вывазам імкнемся разбурыць капіталістычны сьвет. І характэрна, што капіталісты заўсёды процістаўляць увесь капіталістычны сьвет Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Ну, а скажаце, калі ласка, хіба-ж гэта не пакажаецца нашымі пакупкамі? Бо на тую-ж агульную суму, якую мы атрымліваем ад свайго продажу за граніцу, на гэту-ж суму мы і купляем заграничных тавараў. Калі наш продаж у мінулым годзе раўняўся 900 млн. руб., дык якраз на гэту-ж суму мы і купілі заграничных тавараў. Нашэ Савецкі Саюз ні аднэй унцыі золата ня вывез з-за граніцы.

Нарэшце, давайце аголім гэта пытаньне, пытаньне ўзаемнага тавараабароту. Што мы вывозім за граніцу? У асноўным, таварышы, **мы прадаем лес, нафту, футру, марганцавую руду і, параўнальна з даваенным часам, нязначную колькасьць збожжа.** Таварышы, кожны згодзіцца, што ў гэтых тав

X зьезд ЛКСМБ

КАМСАМОЛ — *ударная брыгада*

Са справаздачнага дакладу тав. ПАЛЯКОВА

Справаздачны даклад ЦК ЛКСМБ X зьезду **т. Палякоў** пачынае з характарыстыкі мінулага пэрыяду паміж IX і X зьездамі, з ацэнкі тых умоў, у якіх працавў і змагаўся камсамол Беларусі.

Ва ўступнай частцы свайго дакладу т. Палякоў падрабязна спыняецца на дасягненьнях рабочае клясы ў сацыялістычным будаўніцтве краіны, на абвастрэньні клясавай барацьбы, на посьпехах пяцігодкі, якія выклікаюць шалёную нянавісьць сусьветнай буржуазіі.

Уся работа камсамолу Беларусі за час паміж зьездамі праходзіла пад сьцягам змаганьня за ленінскую лінію партыі. ЛКСМБ, змагаючыся з рознымі контррэвалюцыйнага трацкізму, вёў і вядзе змаганьне з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе. ЛКСМБ даў аднадушны адпор усялякім спробам правых і «лявацкіх» элементаў супроцьстаяць ленінскі камсамол бальшавіцкай партыі.

Камсамольская арганізацыя Беларусі рашуча асудзіла Мінаевых, Бутырыкіных і іх аднадумцаў у БССР — Целішавых і дала бязьлітасны адпор правааапартуністычнай хлусьні на лінію партыі ў разьвіцьці УсесЛКСМ.

Спыняючыся на ўдзеле камсамолу ў будаўніцтве сацыялістычнай прамысловасьці, т. Палякоў адзначае бурны рост капіталаўкладаньняў у прамысловасьць БССР, рост рабочае клясы, прыводзіць лічбы аб значных зьменах у эканоміцы БССР за апошнія тры гады з часу IX зьезду.

Ва ўсёй рабоце па ператварэньні краіны з аграрна-індустрыяльна-аграрную значнае месца займае ленінскі камсамол, які, захоўваючы свае баявыя традыцыі, быў у першых радох барацьбітоў за перамогу сацыялізму, быў адданым сваёй партыі на выкананьне паставленых ёю задач — і ў гэтай рабоце паказаў, што партыя не памылялася, калі заўчыла камсамол адным з галоўных сваіх памочнікаў у вырашэньні ўсіх задач, якія стаяць перад ёй.

— Камсамол, як ва ўсім Саюзе, так і ў нас на Беларусі, — гаворыць т. Палякоў, — у адказ на ўзросшыя запатрабаваньні рэканструкцыйнага пэрыяду зазнаўся ініцыятарам па ажыцьцяўленьні ідэй Леніна аб сацыялістычным спаборніцтве, аб ударніцтве, якія зараз-жа былі падхоплены шматмільённай рабочай клясай. Карыстаючыся мэтодам сацыялістычнага спаборніцтва, камсамол ад часовых мерапрыемстваў па ўцягненьні шырокіх мас моладзі ў актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве — праз ударныя брыгады, праз арэрацыйна-бытавыя камуны дабіўся таго, што паварот камсамолу тварам да вытворчасьці ў асноўным ажыцьцёўлены.

На Беларусі камсамольцы ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам у сярэднім на 83 проц. У некаторых арганізацыях гэты процант значна большы.

Тав. Палякоў падае дзесяткі фактаў, як камсамольская арганізацыя Беларусі адгукнулася на верасьнёўскую адозву ЦК УсесКП(б). Праз сацыялістычнае спаборніцтва і ударніцтва дзесяткі і сотні камсамольскіх ячэек арганізавалі масы рабочай моладзі на змаганьне за выкананьне прамфінпляну другога году пяцігодкі і асобнага кварталу. У выніку напружанай бальшавіцкай работы дзесяткі прадпрыемстваў ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае прамфінпляны.

Камсамольскія калектывы заводаў і фабрык БССР, якія здолелі сапраўды перабудаваць сваю работу, здолелі стаць на чале актыўпасьці і творчага ўздыму рабочай моладзі, дасягнулі значных посьпехаў на выкананьню дырэктыў партыі аб росьце за лік рабочай моладзі.

Тав. Палякоў падкрэсьлівае, што, ня гледзячы на ўзросшую ролю камсамолу ў будаўніцтве сацыялістычнай прамысловасьці, усё-ж камсамол недазваляюча прымае ўдзел у плянаваньні народнай гаспадаркі. З прычыны такога становішча мы вельмі часта не скарыстоўваем рад юнацкіх пытаньняў і магчымасьцяй больш канкрэтна ставіць перад камсамольскай арганізацыяй задачы па ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве.

Другім адстаючым вучасткам у гэтай справе зьяўляецца ўдзел камсамолу ў капітальным будаўніцтве. Камсамольскія арганізацыі вельмі мала цікавіліся капітальным будаўніцтвам і недастаткова працавалі на выкананьні плянаў, зьніжэньні сабекошту і падвышэньні якасьці будаўніцтва.

Трэцім адстаючым вучасткам зьяўляецца работа камсамолу на чыгунцы. Чыгуначныя ячэйкі не перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія партыя паставіла перад транспартам.

Далейшая работа ЛКСМБ у галіне ўдзелу па будаўніцтве сацыялістычнай прамысловасьці павінна разгортвацца ў напрамку замацаваньня дасягнутых посьпехаў і скаўчэньня перабудовы ўсіх форм і мэтадаў работы ў адпаведнасьці з задачамі, якія партыя паставіла перад камсамолам у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Пераходзячы да характарыстыкі становішча рабочай моладзі, т. Палякоў, адзначае, што БССР на сёняшні дзень ня мае ніводнага беспрацоўнага з ліку маладых рабочых і палетклу і спыняецца на адносінах паміж камсамолам і прафсаюзамі.

— Зьезду вядома, — гаворыць ён, — што на працягу доўгага пэрыяду паміж камсамолам і прафсаюзамі, на чале якіх стаяла старое апартуністычнае кіраўніцтва, вялася жорсткая барацьба, як па пытаньнях сацыялістычнай арганізацыі працы моладзі, так і на пытаньнях агульнай работы прафсаюзаў. Напы спрэчкі ад ФЗН, аб падрыхтоўцы кадраў, на сутнасьці, былі змаганьнем за падрыхтоўку кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя зьняла апартуністычнае прафсаюзнае кіраўніцтва і пасталіла людзей, якія змогуць пасьпяхова праводзіць лінію партыі ў рабоце прафсаюзаў. Абавязак камсамоду — дапамагчы прафсаюзам перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з адачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Гаворачы аб удзеле ЛКСМБ у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, т. Палякоў падрабязна спыняецца на выніках работы камсамольскай арганізацыі па выкананьні дырэктыў партыі аб калектывізацыі бяднякта-сераднякцкіх гаспадарак, на выніках пасеўнай і ўборачнай кампаніі мінулага году. Тав. Палякоў жорстка крытыкуе памылкі ЦК ЛКСМБ, якія былі зроблены ў часе першай бальшавіцкай вясны па пытаньнях калектывізацыі.

— ЦК ЛКСМБ прызнаў свае палітычныя памылкі і над кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б мабілізаваў арганізацыю на іх выпраўленьне. У барацьбе з клясавым ворагам, правым апартунізмам і «лявацкімі» перагібамі камсамольская арганізацыя дабілася значных посьпехаў у галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Тав. Палякоў падае дзесяткі прыкладаў бальшавіцкай работы камсамольскіх ячэек у галіне калектывізацыі, замацаваньня калгасаў, росту за лік калгасьнікаў і батракоў.

За апошні час назіраецца некаторы зрух у справе паляпшэньня работы з батрацтвам і беднатой, але ўсё-ж атэнка ЦК КП(б)Б аб тым, што работа сярод батрацтва і беднаты на лініі КСМ зьяўляецца далёка невыстарчальнай — застаецца правільнай.

Спыняючыся на далейшых задачах вясковых камсамольскіх арганізацый, тав. Палякоў падкрэсьлівае ўсю важнасьць работы камсамолу на вырашэньні праблемы жывёлагадоўлі, па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны, па выкананьні дырэктыў партыі аб разгортваньні інтэнсыўнай работы па калектывізацыі.

У свой час ЦК УсесЛКСМ канстатаваў, што камсамольская арганізацыя Беларусі слаба прымала ўдзел у нацыянальна - культурным будаўніцтве, стаяла ў баку ад барацьбы з контррэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і праявамі рознага роду шавінізму. Арганізацыя недаацэньвала значэньне ажыцьцяўленьня задач партыі ў галіне беларусізацыі.

Гэта адэка ў значнай меры застаецца правільнай і ў адносінах сучаснай работы камсамольскай арганізацыі па нацыянальна - культурным будаўніцтве. Камсамол ня ўзяў яшчэ патрэбных баявых тэмпаў работы на ўдзелу ў нацыянальна - культурным будаўніцтве. На гэтым вучастку тэмпы нашай работы адстаюць ад агульных сэмпаў нацыянальна - культурнага будаўніцтва нашай рэспублікі і ў паасобных зьвяньнях не адпавядаюць данай паласе разьвіцьця нацыянальна - культурнага будаўніцтва.

Тав. Палякоў, пераходзячы да пытаньня аб змаганьні за моладзь, спыняецца на рабоце нацдэмаў сярод моладзі.

— Барацьба за моладзь нацыярджаецца работай контррэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія ставілі адпэй з важнейшых сваіх задач — выхаваньне сваіх сем'яў моладзі ў контррэвалюцыйным духу. Тав. Палякоў прыводзіць рад вытрымак з паказаньня Краскоўскага, Некрашэвіча, Лёсіка і інш., з якіх відаць, што контррэвалюцыйная інтэлігенцкая група нацыянал -дэмакратаў прымала ўсе заходы, каб у савецкай школе арганізаваць ячэйкі прыхільнікаў да нацыянал-дэмакратычных ідэй.

Х зьезд ЛКСМБ павінен з усёй жорсткасьцю шляхам бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі выкрыць недахопы ў нашай рабоце і вызначыць бальшавіцкі шлях работы ЛКСМ па ажыцьцяўленьні тых задач, якія стаяць перад камсамолам у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

— **ЛКСМБ**, — гаворыць т. Палякоў, — ніколі ня быў нэйтральным у змаганьні за генэральную лінію партыі, а бязьлітасна змагаўся з усякімі адхіленьнямі ад яе — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, так і з паўтрацкісцкімі наскокамі на лінію партыі. У змаганьні з клясавым ворагам і адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі камсамол прыходзіць да свайго зьезду ідэйна і палітычна ўзросшым.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ленінскі камсамол быў і будзе ўдарнай брыгадай на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Спрэчкі

Па дакладу тав. ПАЛЯКОВА аб рабоце ЦК ЛКСМБ разгарнуліся шырокія прэчкі. Выказалася больш 60 дэлегатаў.

Выступаўшыя адзначалі, што за прамежак часу ад IX да X зьезду ленінскі камсамол Беларусі дасягнуў значных посьпехаў па ўдзеле ў сацыялістычным будаўніцтве краіны. Камсамольская арганізацыя ў асноўным перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, паставіла ў цэнтр увагі сваёй работы змаганьне за сацыялістычную прамысловасьць і за новую сацыялістычную вёску. ЛКСМБ да свайго X зьезду прышоў з вялізарным вопытам клясавага змаганьня, загартаваны ў клясавых баёх з кулацтвам, у змаганьні з адхіленьнямі ад ленінскай лініі, з правым апартунізмам і з «левымі» наскокамі на генэральную лінію партыі, з нацыянал-апартунізмам, з вялізадзяржаўным шавінізмам, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх копераў.

У баёх за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі вырасьлі новыя кадры камсамольскага актыву, узрасла арганізацыя на 40 тыс. чал. за лік рабочай, батрацкай і пепшай часткі сераднякцкай моладзі. Камсамол Беларусі даў бязьлітасны адпор «тэорыям» апартуністаў справа аб перавыхаваньні маладога купака, аб стварэньні «саюзаў сялянскае моладзі».

Апошні год работы ЛКСМБ быў годам змаганьня з прышчэпаўскай палітыкай, са стаўкай на адзінасобную заможную гаспадарку. Посьпехі гэтага змаганьня пацьвярджаюцца тым, што камсамол у сваіх радох налічвае больш 11 тыс. калгасьнікаў-камсамольцаў, больш тысячы калгасных ячэек, 67 проц. камсамольцаў, якія ўвайшлі ў калгасы.

Выступаўшыя ў спрэчках адзначалі, што работа транспартных ячэек ня ўзьнята на вышыню палітычных задач, якія партыя паставіла перад транспартам. Транспартныя ячэйкі яшчэ ня скончылі перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Тав. ПАЦУКОЎ спыняўся на пытаньнях аб павышэньні кваліфікацыі рабочай моладзі. Прамоўца прыводзіў лічбы, якія сьведчаць аб вялікім процанце сярод рабочай моладзі некваліфікаванага малодняка.

Тав. Епін зьвярнуў увагу зьезду на работу рэдакцыі газ. «Чырвоная Зьмена». Газэта зусім мала паказвае на сваіх старонках узоры бальшавіцкай работы камсамольскай арганізацыі па рэкан струкцыі сельскае гаспадаркі.

Многія з выступаўшых спыняліся на пытаньні работы з беднатой, батрацтвам, на арганізацыі працы ў калгасах. Дэлегаты гаварылі аб тым, што ЦК ЛКСМБ невыстарчальна перабудаваў сваю работу ў сувязі з ліквідацыяй акруг і ўзмацненым раёнаў.

Ня зьнімаецца з парадку дня пытаньне работы сярод дзяцей, пытаньне падрыхтоўкі адпаведных кадраў камсамольскага актыву для работы ў піянэрскай арганізацыі.

* *

На зьезьдзе з паклёпніцкімі права-апартуністычнымі «тэорыямі» выступілі т. т. ШУРЫЦ і ВАЙНШТЭЙН, якія прабавалі давесьці, што вясковая камсамольская арганізацыя ніздольна ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, нездольна змагацца за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Шурыц адважыўся з трыбуны зьезду адкрыта прапагандаваць ушчэнт разьбіты тэорыі Бутырыкіных і Целішавых аб крызісе камсамольскага актыву, аб нездольнасьці камсамолу змагацца ў першых радох пралетарыяту і працоўнага сялянства за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Шурыц прабаваў давесьці, што ў вёсцы камсамол ня мае актыву, адмаўляў магчымасьці росту актыву з ліку батрацкай, бядняцкай, калгаскай моладзі. Шурыц праз апартуністычныя акупары не зауважыў вялізарнай актыўнасьці, творчага энтузіязму працоўнай моладзі, якая стала на шлях калгаснай гаспадаркі, якая ўпарта змагаецца ў радох камсамолу, пад кіраўніцтвам партыі, на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Шурыц «сыгналізаваў» аб адсутнасьці росту камсамолу за лік рабочай моладзі, тлумачачы гэта слабай работай камсамолу па палепшэньні матар'яльнага становішча рабочай моладзі.

Шурыц не зауважыў тысяч маладых рабочых, якія пад сьцягам ленінскага камсамолу выконваюць і перавыконваюць прамфінпляны, якія штодня папаўняюць рады УсесЛКСМ.

За Шурыцам выступіў Вайнштэйн, які цалкам салідарызаваўся з выступленьнем свайго субрата-апартуніста.

Дзесяткі дэлегатаў у сваіх жорсткіх выступленьнях далі рашучы адпор выпазкам гэтых апартуністаў, разьбілі ўшчэнт тэорыі аб крызісе актыву, аб нездольнасьці вясковай камсамольскай арганізацыі змагацца за лінію партыі.

Зьезд прызнаў заяву, падную Шурыцам у прэзыдыум аб сваім выступленьні, яўна нездавальняючай. Зьезд перадаў пытаньне аб выступленьні Шурыца на разгляд новага складу ЦК і даручыў ЦК абсьледаваць работу ЧАШНІЦКАЙ арганізацыі камсамолу, на чале якой стаяў апартуніст Шурыц.

* *

З вялікай прамовай аб задачах камсамольскай арганізацыі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі па дакладу ЦК ЛКСМБ выступіў тав. ГАНТМАН.

Тав. Гантман падкрэсьліў, што беларускі камсамол за апошнія гады правёў вялізарную работу па дапамозе партыі ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ў будаўніцтве сацыялістычнае прамысловасьці.

* *

Зьезд, заслухаўшы даклад т. ГОЛЬДШТЭЙНА аб перспэктывах разьвіцьця электрыфікацыі БССР, ПРЫНЯЎ ПАСТАНОВУ АБ УЗЯЦЬЦІ ШЭФСТВА НАД ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯЙ КРАІНЫ.

Учора ў канцы ранішняга пасяджэньня зьезд заслухаў заключнае слова тав. ПАЛЯКОВА.

Падагульваючы спрэчкі, тав. Палякоў са здавальненьнем канстатаваў, што зьезд аднадушна адкінуў тэорыі правых ад патуханьні актыўнасьці ў камсамоле, да канца выкрыў сапраўдныя намеры апартуністаў замазаць клясавае змаганьне, зьнізіць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

На вячэрнім пасяджэньні разгарнуліся спрэчкі па дакладу тав. Рубенчыка аб задачах ЛКСМБ у нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Да вынікаў „тыдню Савецкай Беларусі" ў Маскве

(ГУТАРКА СА СТАРШЫНЁЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў МАСКВЕ ТАВ. ЧАРНУШЭВІЧАМ)

Перад ад'ездам беларускай дэлегацыі з Масквы наш карэспандэнт гутарыў са старшынёю дэлегацыі тав. ЧАРНУШЭВІЧАМ адносна вынікаў «тыдню». У гэтай гутарцы тав. Чарнушэвіч заявіў наступнае. Першае, што я павінен з асаблівым здавальненьнем адзначыць — гэта сапраўды брацкія, сардэчныя і ўважлівыя адносіны да нас з боку маскоўскіх пралетараў і партыйнай грамадзкасьці сталіцы.

На працягу ўсяго «тыдню» мы ня раз сустракаліся з ударнікамі Масквы. Выступаючы на партыйных канфэрэнцыях, наведаўшы дзесяткі буйных заводаў, як «Трохгорка», электразавод «Серп і Молат», майстэрні МББ чыг. і інш., — наша дэлегацыя сустракала ўсюды самыя ўважлівыя адносіны да сябе, знаёмячыся падрабязнейшым чынам з цікавым і вялізарным вопытам барацьбы маскоўскіх ударнікаў за пяцігодку.

З наменшай увагай слухалі маскоўскія рабочыя на шматлікіх вечарох і сходах гэрачныя расказы ўдарнікаў і калгасьнікаў Савецкай Беларусі, якія з посьпехам будуюць пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б сацыялістычную гаспадарку і культуру.

Маскоўскія пралетары паказалі, што яны разам з намі ганарацца дасягненьнямі БССР. Маючы перад вачыма гіганцкія дасягненьні Савецкай Беларусі, пралетарыят чырвонай сталіцы праз жывых непасрэдных сведак — былых беларускіх паслоў у польскі сойм—пераканаўся, у якім страшэнна жудасным становішчы знаходзіцца сёньня ДРУГАЯ ЧАСТКА БЕЛАРУСІ — ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ, ПРЫГНЕЧАНАЯ ПОЛЬСКІМ ФАШЫЗМАМ.

Падагульваючы вынікі «тыдню», мы з задаваленьнем канстатуем, што асноўная яго мэта: азнаямленьне пралетарскай грамадзкасьці сталіцы з дасягненьнямі БССР і замацаваньне брацкай дружбы паміж працоўнымі Савецкай Беларусі і пралетарскай грамадзкасьцю Масквы, што гэта мэта дасягнута. Адным з пацьвярджэньняў гэтага зьяўляецца прыняцьце шэфства перадавым лепшым прадпрыемствам Масквы «Трохгорная Мануфактура» над тэкстыльнай фабрыкай «Дзьвіна» ў Віцебску. «Тыдзень» спрыяў таксама замацаваньню дзелавых сувязяй па лініі гаспадарчай, навуковай, мастацтва і літаратуры, аб чым сьведчаць дзесяткі вечароў і навуковых дакладаў аб БССР, якія праводзіліся ў доме вучоных, Камакадэміі, у клюбах і г. д.

Нарэшце, дэманстрацыя посьпехаў ленінскай нацыянальнай палітыкі на справе зьяўляецца лепшым адказам на паклёпы як вялікадзяржаўных шавіністаў, якія выказваюць пагардлівасьць да нацыянальных рэспублік, таксама і беларускіх нацыянал - дэмакратаў — агентаў польскага фашызму. Той прыём, які быў аказан маскоўскай пралетарскай грамадзкасьцю лепшаму з нашага пралетарскага мастацтва па лініі тэатру, кіно і літаратуры, зьяўляецца лепшым довадам правільнасьці шляху пралетарыяту БССР, які творыць культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце. Гэты прыём зьяўляецца лепшым заклікам да нашых работнікаў мастацтва, пісьменьнікаў, эртыстаў і кліча іх да сапраўды ўдарнай работы, да новых посьпехаў на культурным фронце.

Наша дэлегацыя ў поўным складзе была прынята старшынёю ЦВК СССР тав. Калініным. Мы прыносім нашу шчырую падзяку ўсесаюзнаму старасьце за тую ўвагу і цеплату, з якімі ён сустрэў і гутарыў з намі.

Разьвітваючыся сёньня з чырвонай сталіцай і прыносячы падзяку Маскоўскаму камітэту партыі і ў яго асобе пралетарскай грамадзкасьці сталіцы, мы заяўляем маскоўскім рабочым: ударнікі Беларусі, падбадзёраныя вашай увагай, вашай практыкай і бальшавіцкай барацьбой за перамогу пяцігодкі, будуць з яшчэ большай энэргіяй працаваць у сябе над тым, каб, выконваючы дырэктывы 16 зьезду УсеКП(б), ператварыць Савецкую Беларусь у прамысловa - калгасную сацыялістычную краіну. Мы не пашкадуем сіл, каб перад тварам надыходзячых баёў зрабіць з Савецкай Беларусі непераможны фарпост СССР на заходнім рубяжы.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) і яго правадыр тав. Сталін, што цьвёрда вядзе нашу савецкую краіну да перамогі сацыялізму!

Няхай жыве авангард пралетараў Савецкага Саюзу ў барацьбе за пяцігодку за чатыры гады — пралетарыят чырвонай Масквы! Няхай умацоўваецца інтэрнацыянальнае адзінства працоўных Савецкага Саюзу!

* *

Сёньня ў Ленінград ад дэлегацыі выяжджае тав. Рычкоў і настаўніца тав. Мазур для правядзеньня сходу ў Ленінградзе, прысьвечанага вынікам «беларускага тыдню» ў Маскве.

ЦК КП(б)Б і ўраду БССР

(Прывітаньне, прынятае на вечары ў КУНМЗ, у Маскве, 6-га студзеня)

Калектыў студэнтаў, выкладчыкаў, рабочых і служачых КАМУНІСТЫЧНАГА ЎНІВЭРСЫТЭТУ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЎ ЗАХАДУ шле вам, і ў вашай асобе рабочым і працоўным масам БССР, свае гарачае пралетарскае прывітаньне.

На грунце ленінскай палітыкі партыі, на грунце бальшавіцкага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, БССР з краіны надта адсталай, з былой паўканіэніі царызму ператварацца ў краіну сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі, у краіну, дзе ліквідаван беспрацоўе і ніўхільна павышаецца матар'яльны і культурны ўзровень пралетарыяту і працоўнага сялянства, дзе буйна ўзрастае беларуская культура і культура нацыянальна — нацыянальная па форме, сацыялістычная па зьмесьце.

Сход пераконаны, што БССР, пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі і савецкай улады, пры дапамозе ўсяго СССР, цьвёрда і пэўна будзе ісьці наперад па шляху далейшых перамог на фронце гаспадарчага і нацыянальна-культурнага сацыялістычнага будаўніцтва.

КП(б)Б вяла і будзе вясьці непрымірымую барацьбу з правым і «левым» ухілам, а таксама з вялікадзяржаўным шавінізмам, з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных копераў.

Пасьпяховым правядзеньнем ленінскай нацыянальнай палітыкі, КП(б)Б і ўрад БССР яшчэ больш узмоцняць Савецкую Беларусь —гэты фарпост СССР на рубяжы з капіталістычным сьветам.

Посьпехі БССР — ясны, прывабны прыклад для працоўных Захаду, для працоўных Заходняй Беларусі, у якой пануе нябачаны сацыяльны і нацыянальны ўціск і тэрор польскага фашызму, які апіраецца на сваю агентуру — беларускіх нацыянал-фашыстаў.

Наша брацкае прывітаньне КПЗБ, якая кіруе гэтай барацьбой ва ўмовах жорсткага фашысцкага тэрору!

Няхай жыве інтэрнацыянальная салідарнасьць працоўных!

Няхай жыве БССР!

Нахай жыве КП(б)Б!

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

З КОЖНЫМ ДНЁМ

РАСЬЦЕ ГАСПАДАРЧЫ РАЗВАЛ

Закрываюцца ўсё новыя ! новыя фабрыкі і заводы, тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу

Капітал разгорнутым фронтам наступае на рабочую клясу Польшчы і Зах. Беларусі.

РАБОЧЫЯ МАСЫ ПОЛЬШЧЫ і ЗАХ. БЕЛАРУСІ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КПП і КПЗБ, ГЭРАІЧНА ЗМАГАЮЦЦА СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ

ВІЛЬНЯ. Ва ўмовах глыбокага і працяжнага гаспадарчага крызісу пануючыя клясы Польшчы ва ўсю разгортваюць эксплёатацыю і пераладжэньне ўсяго цяжару крызісу на рабочую клясу. З мэтаю пашырэньня сваёй эксплёатацыі і рынкаў збыту яны шалёным тэмпам рыхтуюцца да ўзброенага нападу на СССР—вогнішча сусьветнай рэвалюцыі.

Націск капіталістаў на рабочую клясу Заходняй Беларусі выяўляецца ў першую чаргу ў павялічэньні скарачэньня рабочых у спробах зьменшыць заработную плату.

За апошні час у Вільні закрыта гута, абвешчан лёкаут на тартаках з мэтай зьмяншэньня зарплаты. На цагельных фабрыканты зьнізілі зарплату да 4 з паловай злотых за 1000 цэглаў. На фабрыцы Пёмаскага ў Горадні павялічаны рабочы дзень. На тартаках колькасьць рабочых скарочана **на 50 проц.**, на цагельных і запалкавай фабрыцы таксама. На патрабаваньне рабочых аб зьмяншэньні запазычанасьці на каменаломнях у **Клёсаве** абвешчан лёкаўт. Павялічана норма выпрацоўкі, уведзены акорды ва ўсіх аддзяленьнях і зьменшана зарплата на запалкавай фабрыцы ў гор. **Пінску.** На фанэрных фабрыках у гор. **Пінску і Горадні** скарочана каля 30 процантаў усіх рабочых. Зьніжана зарплата на фанэрнай фабрыцы ў **Беластоку на 15 проц.** Зьмяншаецца зарплата тэкстыльшчыкам, сярод якіх зноў пачалося скарачэньне. **Закрываюцца да 50 процантаў усіх працуючых тэкстыльных фабрык.**

Вось некалькі фактаў, якія ілюструюць гэты націск капіталу на рабочую клясу ў Заходняй Беларусі, якая гвалтоўна адарвана ад БССР і падпарадкавана каленіяльнай палітыцы польскага імпэрыялізму.

Але гэта не праходзіць бясьследна для капіталістаў і фашысцкай дыктатуры, для яе акупацкай улады на Заходняй Беларусі павялічваецца лік экзаменных забастовак, якія адбываюцца ў найцяжэйшых умовах абвостранага тэрору і носяць зацяты і працяжны характар контр - наступленьня і наступленьня на фашысцкую дыктатуру пад кіраўніцтвам КПЗБ. Рабочыя пры будове цэмэнтнага заводу на **Бухаўшчыне (Мандзэчна), тартачнікі, цагельнікі, футраўшчыкі і краўцы ў Вільні, рабочыя на фабрыцы Нёманскага ў Горадні, рабочыя запалкавай фабрыкі ў Пінску, тэкстыльшчыкі і фанэрнікі ў Беластоку, пекары,** а таксама **рабочыя** пры **пабудове аэрадрому ў Парахоўшах** — вось жменька фактаў апошняй барацьбы рабочае клясы Зах. Беларусі супроць наступленьня прадпрыемцаў на заработную плату, на павышэньне рабочага дня і супроць скарачэньня.

ВАРШАВА. Кожны дзень атрымліваюцца весткі аб тым, як польскія капіталісты, абшарнікі і іх фашысцкая дыктатура, пры непасрэдным удзеле не агентаў у рабочай клясе — сацыял - фашыстаў заганяюць краіну ў бездань цяжкага гаспадарчага крызісу. Кожны дзень атрымліваюцца весткі аб усё новым закрыцьці фабрык, заводаў, гут, тартакоў і г. д. і звальненьні соцень тысяч рабочых, якія выкідваюцца проста на вуліцу на галодную сьмерць.

Хаця паводле афіцыяльнай статыстыкі ўраду, лік беспрацоўных расьце толькі па дзесятках і сотнях чалавек, аднак факты гавораць зусім іншае. **Яны** гавораць, што **беспрацоўе расьце тысячамі і цяпер ужо дасягае разам з сем'ямі звыш мільёну чалавек. Сотні і тысячы новых звольненых рабочых,** якія выкідваюцца на вуліцу, **зусім не бяруцца статыстыкай на вучот** і ім не даецца ніякай дапамогі. Вось што гавораць апошнія факты.

З 25 сьнежня закрыўся рад гут Верхняй Сілезіі, закрыліся практычныя аддзелы на гуце **«Пэкою», «Бісмарк» і «Фальва»,** з якіх звольнена сотні рабочых.

У мэталёвай пераапрацоўчай прамысловасьці закрылісь новыя цэхі і абмежавалі сваю работу цэхі па выпрацоўцы арматуры, фасфарбронзы і інш., якія цяпер працуюць толькі па 3-4 дні на тыдзень і таксама звольнена шмат рабочых.

У Варшаве ня мэталёвых і іншых заводах звольнены новыя сотні рабочых. Мэталёвая фабрыка **«Норблін»** у канцы сьнежня звольніла 200 рабочых, а некалькі тыдняў таму назад гэтай-ж самая фабрыка звольніла каля 50 рабочых. Прадпрыемцы, накідаючы рабочых яшчэ працаваць па 3-4 дні ў тыдзень, ускладваюць на іх увесь цяжар крызісу. Надбаўляюць рабочым яшчэ на 2 гадзіны працы больш той нормы, якая існавала раней. За гэтыя дабавачныя гадзіны фабрыканты зусім адмаўляюцца плаціць, як за звышнармовую работу, за якую яны раней плацілі і якую рабочыя дружнымі і цяжкімі забастоўкамі вытрывалі ў капіталістаў. Пасьля звальненьня на гэтай фабрыцы 200 чалавек, рабочыя на масоўках і сходах выступілі супроць скарачэньня і адкідулі ўсе прапановы прадпрыемцы. Прадпрыемца выклікаў на фабрыку паліцэйскі атрад для «уціхамірэньня» рабочых. Вось якім нарадкам праводзіцца эксплёатацыя і перакład усяго цяжару крызісу на рабочую клясу.

Фабрыкі сельска-гаспадарчых машын у Польшчы таксама скарацілі сваю працу і звольнілі масу рабочых. Яны зусім цяпер ня маюць заказаў на сельска-гаспадарчыя машыны, бо ў сельскай гаспадарцы расьце і пашыраецца крызіс.

На ўсім фроне фашысцкая дыктатура пры дапамозе паліцэйскіх атрадаў і сацыял-фашысцкіх банд, праводзіць зьніжэньне заработнай платы. Напрыклад, у **Варшаве камунальным рабочым паніжана іх і да таго жабрацкая зарплата на 50 проц.**

Побач з гэтым фашысцкая дыктатура праводзіць фашызацыю і скарачэньне больніччых кас. Калі да гэтага часу існавала 243 акруговых больніччых кас, дык урад Пілсудзкага мяркуе ліквідаваць іх, а пакінуць толькі 40. Беспрацоўныя ўсюды пазбаўлены дапамогі, якую яны раней атрымлівалі. У некаторых гарадох **дапамога беспрацоўным зьменшана ўжо на 50 і 60 проц., а новыя беспрацоўныя зусім не бяруцца на вучот,** каб потым ім не выдаваць і гэй жабрацкую дапамогі, якая яшчэ дзе-ніадзе адпускаецца для пасобных рабочых груп для падтрыманьня штрэйкбрэхэрства і подкупу.

У адказ на наступленьне прадпрыемцаў **рабочыя пякарань Варшавы 12 тыдняў вялі гэрачную барацьбу супроць зьніжэньня зарплаты, супроць скарачэньня, за прыняцьце выкінутых і павышэньне заработнай платы.** У часе барацьбы было арыштавана 100 рабочых, якія барбарскі былі катаваны ў дэфэзывах і вастрогах. Пры допытах і катаваньнях самы актыўны ўдзел разам з паліцыяй брэлі прадпрыемцы пякарань. Але ня гледзячы на ўвесь тэрор, наперакор сацыял-фашыстам і ў барацьбе з імі, ня гледзячы на тое, што апрача масавых арыштаў паліцыя зусім ня выходзіла з пякарань, вылоўлівала актыўных рабочых і кіраўнікоў забастоўкі, закрыла саюз пекароў і арыштавала яго кіраўнікоў. Усё-ж такі рабочыя пякарань сваёй дружнай барацьбой прымусілі прадпрыемцаў адступіць і выйшлі пераможцамі.

За апошні час расьце і пырыцца злілкі рух **беспрацоўных з лёзунгам — «Хлеба і працы!» — беспрацоўныя штурмуюць ваяводзтвы і магістраты, грамадзь паліцэйскія пастарункі і выступаюць акытўна супроць фашысцкай дыктатуры, пад кіраўніцтвам кампартыі Польшчы.**

Польскі фашызм жыве думкамі аб узброеным нападзе на СССР

Удзел фашысцкай Польшчы ў інтэрвэнцкіх планах міжнароднага імпэрыялізму — усім відомы. Працэс «прампартыі» даў яркія довады актыўнага ўдзелу фашысцкай Польшчы ў міжнароднай камісіі, створаной пры французкім генэральным штабе на падрыхтоўцы вайны супроць СССР. «Практычна інтэрвэнцыя павінна была быць выканана пераважна сіламі Польшчы» (паказаньні Ларычава). Буржуазны польскі друк кожны дзень дае довады падрыхтоўкі польскага фашызму да інтэрвэнцыі супроць СССР. З вялікай старанасьцю праводзіцца сыстэматычна кампанія паклёпаў, інсынуацыі, плётак, страшэнай хлусьні аб СССР, а асабліва аб БССР і УССР. Усё гэта мае на мэце падрыхтоўку так званай «грамадзкай думкі» да нападу на Савецкі Саюз. Бязупынна падаюцца весткі з «аўтэнтычных крыніц» аб сялянскіх бунтах, аб узброенай барацьбе ў Менску, аб прымнечаньнях беларусаў і г. д. Такім спосабам стараюцца фашысты задушыць сымпатыі працоўных мас Польшчы да БССР. З другога боку, праводзіцца вялікая кампанія супроць ідэі пагрозы вайны з боку СССР, каб пад гэтай заслонай ліквамакавала падрыхтоўваецца да інтэрвэнцыі. Чым больш набліжаецца тэрмін інтэрвэнцыі, тым мацней фашысты падкрэсьліваюць пяміпучасьць вайны, як адзінага выхаду з крызісу, які разьдзірае капіталістычны сьвет. З прычыны нового года «Газэта польска» цэнтральны орган пілсудчыкаў, які адлюстроўвае думку найбольш аўтарытэтных урадавых польскіх колаў, выступіла з ацэнкай мінулага 1930 году і з прагнозамі на

Сацыялістычная прамысловасьць патрабуе

АД КОЖНАГА КАЛГАСУ, ВЕСКІ, СЕЛЬСАВЕТУ

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ТЭМПЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Пад прыкрыцьцём гучных рэзалюцый

Загатоўкі ільну ўсё яшчэ прахо-дзяць вельмі слаба. На 1-га студзеня план загатовак ільнавалакна па БССР быў выкананы усяго на 17 проц.

Некаторыя работнікі спасылаюцца на нерэальнасьць заданьняў. Бязумоўна, нельга сказаць, што Наркамгандлю не дануслі ў асобных памылак. Так, Круглянскі раён сваё заданьне на загатоўках ільнянога семя выканаў на 250 проц. **Гэты факт сьведчыць аб тым, што рэальная магчымасьць раёну была перапаменшана Наркамгандлю ў два з паловай разы.**

Адзін з прычын слабога ходу загатовак зьяўляецца невыстарчальнае апэрацыйнае кіраўніцтва і ў прыватнасьці няправільнае разьмеркаваньне сіл. Так, у Дрысенскі раён, дзе ёсьць 7 сельсаветаў, раённымі ўстановамі было мабілізавана для пасылкі на вёскі 70 чал. актыву, па 10 чал. на кожны сельсавет. Здавалася-б, што ў раёне актыву хапае. Між тым, у гэты раён Наркамгандлю была накіравана цэлая брыгада. У той-жа час у Бешанковіцкі раён, дзе раённы камітэт партыі ня можа накіраваць нават на адным чалавеку на сельсавет, быў пасланы толькі адзін упаўнаважаны.

У буйнейшым сельсавеце Бешанковіцкага раёну, дзе ёсьць моцная партыйная ячэйка, кулацка - заможныя гаспадаркі не атрымалі цьвёрдых заданьняў па загатоўках ільну. Пасьля таго, як гэта пытаньне было заўстрапа на раённай партканфэрэнцыі, пасьля таго, як бюро вышэйпаказанай ячэйкі было распушчана, выявілася, што і ў другім сельсавеце таксама ня былі даны цьвёрдыя заданьні кулаком. (Старшыня сельсавету, ён-жа сакратар ячэйкі Папізовіч, заявіў, што ня можа справіцца з гэтай работай.

Гэтыя факты яшчэ раз напамінаюць аб неабходнасьці правільнага разьмеркаваньня сіл паміж раёнамі. Яны сьведчаць аб тым, што ў раёнах за гучнымі рэзалюцыямі не заўважаюць праваапартуністычнай практыкі і не вядуць з ёю рашучай барацьбы. У гэтым хаваецца асноўная прычына ходу загатовак ільну.

ВАЙЦЮК.

На хвалях самацёку

(Віцебскі раён)

Віцебскія раённыя арганізацыі адстаялі ад партыйных і савецкіх дырэктыў па ільназагатоўках. Яны не змаглі паставіць і вырашыць пытаньне аб ільне. Вось канкрэтныя даныя:

Агульная пасеўная плошча Віцебскага раёну ў 1930 г. складала 40.436 гэкт., у 1929 г.—38.992 гэкт., а ільну засеяна у 1929 г.—2.209 гэкт., у 1930 г.—2.186 гэкт. Такім чынам, ня гледзячы на агульнае павялічэньне пасеўнай плошчы ільну ў параўнаньні з 1929 г. было засеяна ў 1930 г. менш...

Апошні план ільназагатовак па Віцебскім раёне—417 тон; па Райкаапсаюзе—250 тон, па Райспажыўтаварыстве—167 тон. На 1 студзеня 1931 г. гэты план быў выканаць усяго на 6,3 проц. (26,3 тон).

Тав. Радзівонаў (Райкаапсаюз) аб прычынах такога мізэрнага процанту выкананьня сам кажа так:

Позна хапіліся, пачыналі...

Вілавочна, што такі процант выкананьня ільназагатовак можа тлумачыцца толькі апартуністычнай работай раённых арганізацый. Зусім недапушчальным зьяўляецца тое, што з 17.507 гаспадарак цьвёрдым заданьнем абкладзены усяго 177 гаспадарак, ці 1 проц. замест 5-7 проц.

Ня лепш з давядзеньнем плану да вёскі і прыняцьцем яго на сходах. У сярэднім, план забясьпечан самаабвясзацельствамі на 22 проц. Сходы бедноты праводзіліся толькі ў пязначнай частцы сельсаветаў. Уся работа была праведзена самацёкам. Характэрна ў Старасельскім сельсавеце, па Валоцкім пункце, лён не здаецца з тае прычыны, што яго быццам няма. А тымчасам гэты самы пункт параўнальна здавальняюча выконвае планы па загатоўках ільнасемя. Апартуністы верацъ таму, што ільнасемя ёсьць, але-ж... ільнавалакна няма.

Таксама дрэнна са здачай ільну па кантрактацыі. Закантрактавана 61 тона, а здана—7,6 тоны. Калгасы павінны былі здаць 71 тону, а здалі—0,5 тоны. Калгасы неапрацавалі большай колькасьці ільну. Не апрацавалі ільну, напрыклад, **«Бальшавік»** — 11 гэкт., калгас **«Імя Чарвякова»**—5 гэкт. Па усіх калгасах лён з 79 гэкт. нават ня мочаны і ня мяты.

Абураючы факт: калгас **«Імя Сталіна»** інфармаваў аб тым, што ён засеяў 110 гэкт. ільну. Па праверцы інструктарам Райкаапсаюзу выявілася, што засеяна ім толькі 63 гэкт. Гэты факт, як нельга лепш, пацьвярджае нясур'ёзныя адносіны раённых арганізацый да справы ільна-загатовак, чым, у асноўным, і тлумачыцца зрыў іх.

Патрэбны рашучыя меры па выкарчоўваньні апартуністычнай практыкі ў віцебскай раённай партарганізацыі — і тады планы ільназагатовак будуць выкананы!

А. Матусэвіч.

Арганізаваць зімовы расьсьціл ільну

Наркамзем СССР і Галоўленкам зьвярнуліся да ўсіх Наркамземаў рэспублік з тэлеграмай наступнага зьместу:

«З прычыны значнай колькасьці не пасланай восеньню ільняной саломы, стварэецца пагроза зрыву свячасовай апрацоўкі ўсёй саломы ўраджаю 1930 г. Гэта ставіць пад удар забесьпячэньне сырцом прамысловасьці і выкананьне экспарту. Адпаведна даным вопытных устаноў і практыкі насельніцтва вашай вобласьці, неадкладна арганізуйце зімовы расьсьціл усёй саломы павышанай ільготнасьці. Пры правядзеньні гэтай кампаніі кіруйцеся інструкцыяй, якая разасланa ільнацэнтрам па сваёй пэрыфэрыі. У адпаведнасьці з наяўнасьцю саломы дайце план студзеньскага расьсьціпу ў раёны.

Правядзеце шырокую масавую прапаганду шляхам скліканьня раённых канфэрэнцый сельскага актыву і сходаў калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

10 студзеня паведаміце па тэлеграфу Галоўленному колькі ёсьць саломы, а таксама колькі трэба паслаць яе зімою.

Сьпешнай поштай паведаміце вашы дырэктывы на месцы.

15, 20, 25 і 30 студзеня тэлеграфуйце Галоўленному ход выкананьня пляну расьсьціпу.

Наркамзем Саюзу ШМІДТ.
Наркамзем РСФСР МУРАЛОЎ.
Старш. Галоўленному АДЗІНЦОЎ».

Шклоўцы абвясьцілі „тыдзень штурму“

ШКЛОЎ. (Наш кар.). На 1-га студзеня план загатовак ільнавалакна выкананы на 32 проц., а ільнасемя — на 62 проц.

Слабы ход загатовак тлумачыцца тым, што раённыя арганізацыі ўсю сваю ўвагу накіравалі на перавыбары сельсаветаў і ня здолелі ўвязаць гэту кампанію з барацьбой за лён. Цьвёрдых заданьняў кулакі ня выконваюць, а раённыя арганізацыі не прыцягнулі вінаватых да адказнасьці.

Раённы камітэт партыі прызнаў ход ільназагатовак нездавальняючым і пастанавіў мабілізаваць увесь раённы партыйны савецкі актыў на ільназагатоўкі. Абвешчан «тыдзень штурму» з 1-га на 8 студзеня. Адказныя работнікі раёну накіраваны ў сельсаветы.

Ян.

Загатоўкі не разгорнуты

СТАРЫЯ - ДАРОГІ. (Наш. кар.). У Стара - Дароскім раёне спажывецкае таварыства ўсё яшчэ не падрыхтавана да правядзеньня ільназагатовак. З пляну ў 470 цэнт. ільнавалакна на 1-га студзеня спажыўкаапэрацыяй плян выкананы толькі на 9,9 проц., па ільнасемі —на 48,2 проц.

Сярод работнікаў каапэрацыі пануюць самацёчныя настроі. Ніякага кантролю і дакладных вестак аб паступленьні ільну ад кулацкіх гаспадарак няма. На некаторых сельсаветах, напрыклад Насяцкім, ільназагатоўкі яшчэ не распачаты. Грамадзкасьць не мабілізавана.

П. Х.

Плян яшчэ не даведзен да асобных паселіш

ПУХАВІЧЫ. (Наш. кар.). Ільназагатоўкі па раёне належным чынам яшчэ не разгорнуты. Заданьне па загатоўках ільнавалакна на 1-га студзеня выкананa на 18,4 проц. і на ільнасемі—на 58,1 проц.

Пляны загатовак у большасьці сельсаветаў не даведзены да асобных паселіш. Зусім бязьдзейнічае апарат спажывецкай каапэрацыі, які не аказвае ніякай практычнай дапамогі сельсаветам у правядзеньні загатовак ільну.

ЗАЦІКАЎЛЕНЫ.

Недагаворанасьць паміж загатоўшчыкамі

КРУГЛАЕ. (Наш. кар.). На 1 студзеня Круглянскі раён выканаў заданьне па загатоўках ільну на 42 проц. Раённы партыйны сход, які адбыўся 2-га студзеня, узяў на сябе абавязак на працягу першай дзесяціднёўкі студзеня дабіцца 100 проц. выкананьня пляну.

Да гэтага часу ня зьнішчана недагаворанасьць паміж асобнымі загатоўшчыкамі. Так, на ст. Талачыно было прыспана 12,5 тон алею для прэміяваньня здатчыкаў ільнянога семя. Гэты алей павінен быць разьмеркаваны паміж Круглянскім і Талачынскім раёнамі. Але, калі былі пасланы фурманкі з Круглянскага раёну, ім адмовілі ў выдачы гэтага алею. У выніку сарвана прэміяваньне здатчыкаў ільнянога семя алеем.

РСІ і пракуратура павінны прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў Талачынскага і райспажывецкага таварыства, якія зрываюць загатоўку ільнянога семя ў Круглянскім раёне.

ГРЭБШТЭЙН.

Прэміі—лепшым

Ільнакананпляводцэнтр вызначыў тры прэміі за лепшую апрацоўку і здачу ільнавалакна. Першая прэмія вызначаецца ў 30.000 р., другая—у 20.000 руб. і трэцяя—сьцяг сыстэмы ільна канапляводчай каапэрацыі.

Белільнасаюз пастанавіў уключыцца ў конкурс. Апрача гэтага, Белільнасаюз таксама вызначыў тры прэміі для выдачы райкаапсаюзам за лепшае выкананьне пляну па здачы і апрацоўцы ільну. Устаноўлена таксама пяць прэмій для прэміяваньня калгасаў, якія з посьпехам выканалі плян ільназагатовак. Калгасы будуць прэміяваны ільнаапрацоўчымі машынамі.

Вызначана 9 прэмій для работнікаў раёнаў і 7 прэмій для работнікаў калгасаў за лепшае выкананьне пляну.

Выдача прэмій будзе праведзена 1-га лютага.

Зламіць супраціўленьне кулака, ударыць па праваапартуністычнай практыцы—асноўным тормазе ў разгортваньні загатовак ільну

Калгасы „Іскра“ і „Чырвоная ніва“ заканчваюць апрацоўку ільну

БЕТРЫНА. (Наш кар.). Калгасы Ветрынскага раёну як належыць яшчэ ня ўключыліся ў загатоўкі ільну. На 1 студзеня калгасамі раёну здана толькі 100 кгр. ільну.

З боку праўленьняў некаторых калгасаў наглядаюцца неданушчальныя адносіны да разгортваньня ільназагатовак. Калгасная маса не мабілізавана на правядзеньне гэтай важнейшай кампаніі. У калгасах імя Карла Маркса, «Чырвоная Полаччына» і «Камінтэрн» частка ільну згніла.

Адначасова ў тых мясцох, дзе калгасны актыў мабілізаваны на выкананьне пляну загатовак, загатоўкі ўжо заканчваюцца. Калгасы «Іскра» і «Чырвоная ніва» на 1-га студзеня амаль што поўнасьцю выканалі свае заданьні на загатоўках ільну. Гэта сьведчыць, што пры правільнай арганізацыі працы, пры мабілізацыі калгасных мас лён можа быць здан поўнасьцю ў тэрмін.

ФЭЛЬДМАН.

Зьнішчыць тормазы

ЛЕЗНА. (Па тэлеграфу). На 1 студзеня даны цьвёрдыя заданьні па загатоўках ільну 376 кулацкім заможным гаспадаркам, што складае 6,4 проц. Заданьне выкананa на 86 проц.

Прыцягнуты да судовай адказнасьці 4 кулацкія і 3 заможныя гаспадаркі за невыкананьне цьвёрдых заданьняў. Аштрафавана 12 гаспадарак. Плян загатовак ільнянога семя на 5 студзеня выкананa на 90 проц., ільнавалакна — на 55 проц.

У раёне адсутнічае газа, ліка, алей і машкі для адпраўкі тэхнічнага ільнянога семя на завод. Не хапае таксама нафты для мляноў. Млыны стаяць і нельга памалоць абожжа для здатчыкаў ільну. Усё гэта тармозіць загатоўкі.

Трэба ўзьдзейнічаць на адпаведныя арганізацыі, каб зьнішчыць гэтыя недахопы.

Сакратар Лёзьненскага райкому
АРЗШЧУК.

Да адказу вінаватых у зрыве загатовак

Як паведамляе газэта «Чырвоная Полаччына» ад 5 студзеня, за бязьдзейнасьць і нядбайныя адносіны да ільназагатовак адданы пад суд былыя старшыні Дампікоўскага і Алесьнаўскага сельсаветаў і старшыня калгасу «Чырвоная Дуброва».

Дзесяць кулацкіх гаспадарак аштрафаваны на 1.000 руб.

Адналасова для ўзмацненьня работы па ільназагатоўках камандыруюцца на месцы 10 брыгад у складзе 45 чалавек.

ХОЙНІКІ, ВЕТРЫНА І ЖЛОБІН — ЯШЧЭ НЕ ПАВЯРНУЛІСЯ ТВАРАМ — ДА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

У ГЭТЫХ РАЁНАХ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ НЯ УВЯЗВАЕЦЦА З АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

„ЛІПАВЫЯ“ ВЕСТКІ І ПОЎНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ—

такі актыў Хойніцкіх арганізацый ў галіне калектывізацыі

Мабілізаваць партарганізацыю на рашучую барацьбу з апартунізмам

ХОЙНІКІ. (Брыгада «Зьвязды»).

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў **Хойніцкім раёне вядзецца яўна нездавальняюча.** Ілюстрацыяй служаць некалькі наступных фактаў.

Пасеўны плян разасланы райкалгасаюзам па калгасах, але апошнія да яго распрацоўкі яшчэ не прыступілі. Калгасы чакаюць... прыезду прадстаўнікоў райкалгасаюзу для ўдзелу ў распрацоўцы гэтых пляноў. А райкалгасаюз з накіраваньнем людзей у калгасы не спяшаецца.

Яшчэ горшая справа ў індывідуальным сэктары. РВК разаслаў, праўда, усім сельсаветам пляны веснавой сяўбы, але гэтыя **планы... ляжаць у сельсаветах** і не распрацоўваюцца прэзыдыумамі саветаў. Ні **райком КП(б)Б**, ні РВК ня маюць дакладных вестак аб сапраўдным ходзе падрыхтоўкі па сельсаветах і калгасах. **Сярод часткі калгаснага і сельсавецкага актыву пануюць апартуністычныя настроі аб нерэальнасьці пасеўных плянаў.** Мясцовыя партыйныя ячэйкі не вядуць барацьбы з такімі ікодашнімі настроямі, не арганізавалі шырокай растлумачальнай кампаніі аб задачах другой бальшавіцкай сяўбы.

Пра бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый у галіне разгортваньня далейшага калгаснага руху сьведчыць той факт, што ў калгасах **яшчэ няма вярбовачных камісій. Амаль няма і ініцыятыўных груп.** На запытаньне—наўжо-ж партыйныя ячэйкі зусім не займаюцца арганізацыяй ініцыятыўных груп—сакратар райкому адказаў:

— Весткам з ячэек нельга верыць, бо яны лінавыя. Наводле гэтых вестак лічылася, што ў раёне ёсьць 15 ініцыятыўных груп, а калі мы паслалі чалавека праверыць, дык выявілася, што ў сапраўднасьці няма ні адной.

Трэба адзначыць, што райком і РВК кожны дзень рассылаюць ячэйкам і сельсаветам кіны папяровых інструкцый, аднак, **ніякай праверкі выкананьня дырэктыў няма.** Я быў у некаторых калгасах і пераканаўся, што ўсе гэтыя **шматлікія цыркуляры ў большасьці нават ня чытаюцца.**

У паасобных калгасах **не заўважаецца прыліву з прычыны безгаспадарчасьці і напружанасьці адносін паміж калгасьнікамі і адзінаасобнікамі, кзрацей кажучы, з прычыны дрэннага кіраўніцтва.** Прыкладам можа служыць **калгас імя Сталіна**, старшыня якога, член партыі, **Хацімчанка, скрыўіў лінію партыі** па радзе пытаньняў. Гэты-ж Хацімчанка зьяўляецца сакратаром партячэйкі. Замест разгортваньня масавай работы і ажыцьцяўленьня важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній на аснове шырокай мабілізацыі актыўнасьці мас калгасьнікаў і адзінаасобнікаў, **ён займаецца камандваньнем, часта імкнецца падменьваць сельсавет і г. д.** Гэты перагібчык меў нахабнасьць заявіць, што, пакуль яго не забяруць з калгасу, прыліву ня будзе. Такая заява, між іншым, цілкам адпавядае сапраўднасьці і сьведчыць, мусіць, аб тым, што **Хацімчанка сам лічыць сваё прабываньне ў партыі памылкай.**

Тры разы райком партыі пастанаўляў зьняць Хацімчанку з працы, але сваю пастанову так і ня выканаў.

На запытаньне—чаму няма прыліву ў Бабчынскім калгасе—старшыня гэтага калгасу, член партыі **Зелянкоўскі** адказаў наступнае:

— Пакуль у нашым сельсавеце будзе такое шпаркае будаўніцтва (а гэта булаўніцтва працягнецца ўвесь 1931 год), прыліву ня будзе. Адзінаасобнікі зарабляюць пімат грошай на будаўніцтве, значна больш, чым калгасьнікі, і ісьці ў калгас ім нявыгодна. А з другога боку, каапэрацыя дрэнна забясьпечвае нас, так што ніхто ісьці ў калгас ня хоча.

Апартуніст Зелянкоўскі прыкідваецца, што ён зусім ня ведае аб тым, што і калгасьнікі могуць працаваць на будаўнічых работах і зарабляюць ня менш адзінаасобнікаў і нават яшчэ маюць рад прывілей перад адзінаасобнікамі. Наводле заявы гэтага апартуніста выходзіць, што адзінаасобнікі лепш забясьпечваюцца каапэрацыяй, чым калгасьнікі, тым часам калі кожны адзінаасобнік добра ведае, што гэта хлусьня.

Сапраўдныя прычыны адсутнасьці прыліву ў Бабчынскі калгас наступныя: кіраўніцтва ў асобе Зелянкоўскага спадзяецца на самацёк, гэта кіраўніцтва паказала сваю безгаспадарчасьць (28 гэктараў сенажаці ня ўбрана), абвастрыла адносіны з адзінаасобнікамі, ня здолела арганізаваць сацыялістычныя мэтады працы ў калгасе.

Паданыя факты сыгналізуюць аб рэальнай небясьпецы невыкананьня пляну другой бальшавіцкай сяўбы ў Хойніцкім раёне, калі раённае кіраўніцтва, не адкладаючы ні на хвіліну, бальшавіцку ня возьмецца за арганізацыю мас калгасьнікаў і адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на барацьбу за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі. Трэба моцна ўдарыць па ўсіх канкрэтных посьбітах праваапартуністычнай і «лявацкай» практыкі, якія, дапамагаючы кулаку, імкнуцца разбурыць існуючыя калгасы і тармозяць далейшае нарастаньне калгаснага прыліву.

Фарбэраў.

Раўняцца па калектывах „Расьсьвет-пераможца“, „Чырвоны партызан“ і „Адраджэньне“, паказаўшы узор барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі! Рашуча пакончыць з праваапартуністычнай бязьдзейнасьцю і самацёкам і са спробамі паўтарыць „лявацкія“ перагібы

У Майскім і Малевіцкім сельсаветах

па-бальшавіцку змагаюцца за посьпех другой бальшавіцкай сяўбы

А У ЦЭНТРЫ РАЕНУ ПАНУЕ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА І АБЛОМАУШЧЫНА

ЖЛОБІН. (Брыгада «Зьвязды»).

Падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі ў Жлобінскім раёне усё яшчэ не распачата. **Усе раённыя арганізацыі,** пачынаючы ад райкому партыі і канчаючы калгасна-каапэрацыйнымі арганізацыямі, **ганебна бязьдзейнічаюць.** Плян сяўбы і на сёньняшні дзень не даводзіцца да сельсаветаў, не гаворачы ўжо аб давядзеньні яго да кожнага калгасу і вёскі, калгасьніка і адзінаасобніка. **Раённыя арганізацыі** (райзямаддзел) **прытрымліваюцца праваапартуністычнай думкі аб немагчымасьці выкананьня кантрольных лічбаў, якія даны Наркамземам па пашырэньні яравога кліну. Гэтым правам правай практыкі райком КП(б)Б не дае належнага адпору.** Дый сам РК, да рэчы кажучы, пытаньнямі падрыхтоўкі да сяўбы яшчэ не займаўся.

РВК ня кіруе сельсаветамі. І сельсветы да бальшавіцкай сяўбы ня рыхтуюцца. Створаны ў раёне **штаб таксама бязьдзейнічае.**

У сьвятле гэтага асабліва каштоўна адзначыць, што паасобныя парт'ячэйкі, сельсветы і калгасы раёну разгарнулі бальшавіцкую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны.

Майская парт'ячэйка, не чакаючы дырэктыў з раёну, **па-бавому рыхтуецца да бальшавіцкай сяўбы.** Парт'ячэйка разгарнула вялікую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і адзінаасобнікаў Майскага сельсавету. Майскія камуністы **падрыхтоўку** да другой калгаснай вясны **увязваюць з ажыцьцяўленьнем пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б),** якія яны растлумачылі калгасьнікам і адзінаасобнікам сельсавету. У выніку гэтага парт'ячэйка **дабілася вялікіх перамог у барацьбе за разгортваньне калектывізацыі і сапраўды стала на чале новага калгаснага прыліву.**

Калгасьнікі з калгасу **«Расьсьвет—Пераможца»,** арганізаваны ў групы вярбоўшчыкаў, пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі, растлумачылі адзінаасобнікам Майскага сельсавету ня толькі посьнехі свайго калгасу, але і пастановы аб'яднанага пленуму ЦК па пытаньні калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Разгортваючы бальшавіцкую работу па падрыхтоўцы да сяўбы (складаньне пляну, рамонт інвэнтару і інш.), калгасьнікі-пераможцы дабіліся вялікіх посьпехаў. **За апошнія два тыдні па Майскім сельсавеце ў калгасы аб'ядналася 90 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.**

Выступаючы ў паход за посьпехі бальшавіцкай сяўбы, калгасьнікі разгарнулі вялікую работу па падрыхтоўцы да яе. Яны заключылі сацыялістычны дагавор з калгасам імя Х-годьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (Кароткавічы) па лепшую і хутчэйшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы і бальшавіцкае яе правядзеньне. **Калгас «Расьсьвет—Пераможца» ўзяў на сябе такія абавязкі:**

Уцягнуць у калгас ня менш 20 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак в. Майскае. Пасеўную плошчу павялічыць на 20 проц. і да 1-га лютага сабраць увесь насенны фонд, а да 15 скончыць рамонт сельска-гаспадарчых машын і трактараў; **узьняць ураджайнасьць на 15 проц.; поўнасьцю перайсьці на зьдзельную форму аплаты працы,** устанавіўшы цьвёрдую норму выпрацоўкі.

Падрыхтаваць усю конскую і цягавую сілу да сяўбы, разьбіўшы яе на адпаведныя брыгады; рабочыя нарады даваць наводле загадзя складзеных рабочых плянаў і гэтым самым **узьняць прадукцыйнасьць працы ня менш, як на 15 проц.**

Далей калгасьнікі ўзялі на сябе вялікія абавязкі па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва сярод брыгад, патрабуючы такіх-жа баявых тэмпаў работы і ад калгасьнікаў XI-годьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Малевіцкая парт'ячэйка і сельсавет таксама разгарнулі бальшавіцкую работу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Парт'ячэйка і сельсавет ператварыліся ў сапраўдныя штабы кіраўніцтва калектывізацыяй. Яны **сталі на чале новай магутнай хвалі прыліву ў калгасы.**

Калгас «Чырвоны партызан» (Малевіцкі сельсавет), які атрымаў прэмію за лепшую работу, **ужо склаў плян сяўбы і арганізаваў кузьню-майстэрню** для рамонту с.-г. машын і інвэнтару. Пад кіраўніцтвам ячэйкі, пры актыўным удзеле ўсіх сельсаветаўскіх, **вярбоўшчыкі калгасу «Чырвоны партызан» дабіліся вялікіх перамог** у барацьбе за новых дзесяткі калгасьнікаў. **8 дзесяткаў новых калгасьнікаў**—вось вынікі бальшавіцкай падрыхтоўкі да бальшавіцкай вясны.

Адзначаючы прыклады ўзорнай работы паасобных калгасных ячэек, сельсветаў і калгасаў, трэба сказаць, што праваапартуністычная бязьдзейнасьць і стаўка на самацёк у падрыхтоўчай рабоце да сяўбы в боку некаторых раённых арганізацый, гэндэнцыя да зьмяншэньня вызначанай плошчы пад тэхнічныя культуры,—усё гэта зьяўляецца вялікай нагрозай ажыцьцяўленьню пляну веснавой пасеўнай кампаніі, нагрозай выкананьню партыйных дырэктыў аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Праваапартуністычная практыка і абломаўшчына павінны атрымаць ад парт-арганізацыі раёну самы рашучы бальшавіцкі адпор, каб забясьпечыць посьпех другой бальшавіцкай вясны.

Ю. Кісяльгоф.

Арцель „Адраджэньне“ арганізавала новы калгас

Складзен вытворчы плян, створан насенны фонд

(СЬМІЛАВІЧЫ. (Брыгада «Зьвязды»).

Калгас «Адраджэньне» (Абчакі сельсавет), ня гледзячы на сваю маладосьць (арганізаваўся ў мінулую вясну), падыходзіць да другой бальшавіцкай сяўбы з вялікімі перамогамі. Дзякуючы вытворчаму энтузіязму і ўпартай рабоце калгасьнікаў, калектыў дасягнуў вялікіх посьпехаў. Веснавая і асеньняя кампаніі былі скончаны са значным перавышэньнем плянаў. Посьпехі калгасу і ўзорная работа калгасьнікаў узьнялі аўтарытэт калектыву ў вачох адзінаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў.

Калгасьнікі перакапаліся ў перавагах калектыўнай працы. Даход кожнага двара, які ўваходзіць у калгас, значна вышэй даходу адзінаасобнага двара. **У той час, як на кожны працоўны дзень калгасьніка прыпадае 1 руб. 76 кап., на працоўны дзень адзінаасобніка —толькі 50-60 кап.**

Калгасьнікі да тэрміну выканалі свае абавязкі перад дзяржавай. Яны здалі лішкаў збожжа на 50 проц. больш, чым прадугледжвалася плянам.

Вялікія дасягненьні мае калгас «Адраджэньне» і ў галіне будаўніцтва. Ужо пабудаваны два вялікія хлявы для буйной рагатай жывёлы, сьвінарнік з кухняй, стайня, два гумны, тры сьвірны і 2 бетоныя студні. Пабудова двух дамоў налепшыла бытавыя ўмовы батракоў, якія ўвайшлі ў калгас.

Калгас «Адраджэньне» амаль першым пачаў падрыхтоўку да другой бальшавіцкай сяўбы. Ужо складзен вытворчы плян, які абгаворан на сходзе калгасьнікаў. Поўнасьцю засыпан насенны фонд. Распачаты рамонт с.-г. машын і прыхад.

Плян сяўбы прадугледжвае значныя зьмены ў севазвароце калгасу, што дасьць магчымасьць ажыцьцявіць яго спэцыялізацыю ў напрамку жывёлагадоўлі, у прыватнасьці сьвінагадоўлі. Так, плошча пад бульбай павялічваецца на 56 проц., пад аўсом — на 7,8 проц. Намячаецца таксама напружэньне плошчы пад ільном на 30,8 проц.

Калгас «Адраджэньне» ўвязвае падрыхтоўку да сяўбы з разгортваньнем далейшай калектывізацыі. З 7-мі двароў у пачатку ў сваёй арганізацыі калгас вырас да 25-ці. Зараз **калгасьнікі арганізавалі ў сваім сельсавеце новы калгас.**

Посьпехі калгасу «Адраджэньне» ў значнай ступені зьяўляюцца вынікам правільнага кіраўніцтва старшыні калгасу, тав. **Неда** — члена партыі, былога сяўгаснага рабочага. Тав. Неда здолеў згуртаваць вакол сябе калгасны актыў; мабілізаваць калгасьнікаў на барацьбу за выкананьне дырэктыў партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

ФРОЛАЎ.

УНЦЕР-ПРЫШЫБЕЕУСКАЯ-ПРАКТЫКА,

якое не выпраўляюць раённыя арганізацыі

Галавацяпства пры мабілізацыі сродкаў зрывае калгаснае будаўніцтва

ВЕТРЫНА.

Мінулы год даволі ясна паказаў адзінаасобнікам Ветрынскага раёну ўсе вялікарныя перавагі калгаснай гаспадаркі. У той час, напрыклад, калі **даход калгасьніка дасягае ад 300 да 600 руб., даход адзінаасобніка не перавышае 300 руб.** Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыі і барацьбе з кулаком ды агентамі ў партыі, калгасы эканамічна ўмацаваліся. Настрой калгасьнікаў бадзёры.

Усё гэта спрыяла росту калгаснага прыліву за апошнія месяцы. У радзе вёсак колькасьць ініцыятыўных груп расьце з кожным днём. За апошні час **арганізавана 5 новых калгасаў.** У іншучыя калгасы **ўвайшло 206 бяднацка-серадняцкіх двароў.**

Посьпехі ў разгортваньні калгаснага руху былі-б значна большымі, калі-б ня той самацёк, які наглядаецца ў частцы сельсаветаў. Далёка ня ўсе партыйныя арганізацыі на мясцох стаяць на чалі калгаснага руху, не заняцоўваюць яго. Акрамя таго, **дапушчан рад перагібаў, якія дрэнна адбіваюцца на далейшай калектывізацыі. У прыватнасьці, трэба адзначыць скрыўленьні лініі партыі, дапушчаныя пры правядзеньні заготовак. Так, напрыклад, на-рат спэцыялізаваным сьвінагадоўчым калгасам прышлося здаць частку буйных, якія неабходна на корм сьвіням.** З гэтай прычыны **сьвінагадоўчыя калгасы зараз пастаўлены перад новымі труднасьцямі ў справе камплектаваньня сваіх гаспадарак жывёлай.** Такія-ж перагібы ў некаторых мясцох былі і пры загатоўцы збожжавых культур.

Вельмі адмоўна адбіваюцца на ўмацаваньні існуючых калгасаў і напярэдадні калгаснага руху **недапушчальныя перагібы ў справе мабілізацыі сродкаў.** Дзякуючы дзейнасьці сўра-мабілізатараў», кампаніт **Фрадкіна** з мясцовага сельбанку, калгасы перасталі быць гаспадарамі сваіх сродкаў. **Грошы калгасаў, якія ляжаць у сельбанку, БЯЗ ВЕДАМА КАЛЕКТЫВАЎ пераводзяцца на пагашэньне крэдытаў, нават такіх, якія павінны быць пагашаны толькі праз два гады.** І гэта ў той час, як ня адзінаасобнікамі лічацца пратэрміноўкі. **У выніку такой галавацяпскай палітыкі калгасы засталіся без грошай на бягучыя гаспадарчыя выдаткі і лічацца пядоімчыкамі** па абавязковых плацяжох, якіх і цяпер ёсьць каля 6.000 руб. Яшчэ адзін характэрны факт. **У калгасе «Чырвоная зорка» было 2.964 руб.** чыстага даходу, ня надлежна разьмеркаванага сярод калгасьнікаў. Што-ж атрымалася? Гэтаму — калгасу быў ня тэхніка мабілізацыі сродкаў, пры ўмове выкананьня якога трэба будзе з адзначаных **2.964 руб. 2.700 руб. аддаць сельбанку.** Гэта значыць, **што сярод калгасьнікаў заставецца разьмеркаваць... 264 руб. за цэлы год працы.**

Роённа кіраўніцтва, бязумоўна, ведае аб гэтых перагібах, але **чамусьці ўсё яшчэ маўчыць і іх не выпраўляе.** Многа гаварыць ня прыходзіцца аб вялікарнай шкодасьці, якую наносіць калгаснаму руху такая «мабілізацыя» сродкаў. Яна ня мае нічога агульнага з правадзімай партыяй і ўрадам вялікай важнасьці работай па мабілізацыі сродкаў.

Вельмі мала канкрэтнага робіцца ў галіне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Калгасныя пляны раёну ў большасьці яшчэ не гатовы.

Трэба, нарэшце, пакончыць з праваапартуністычнай бязьдзейнасьцю і жорстка ўдарыць на «лявацкіх» нягодах. І праваапартуністычная бязьдзейнасьць і дапушчаныя тут перагібы тармозяць рост посьпехаў у галіне разгортваньня калгаснага руху. Партыйная арганізацыя Ветрынскага раёну павінна, урэшце, мабілізаваць на бальшавіцкае правядзеньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, рашуча змагаючыся з апартуністычнымі элементамі, якія перашкаджаюць выкананьню важнейшых дырэктыў партыі ў галіне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

СЬМЕЛЫ.

Адначасовы збор на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў вясковых раёнах

ПАСТАНОВА ЦВК І СНК СССР

Народна-гаспадарчы плян на 1931 год ставіць вялізарныя задачы па ўздыме сельскае гаспадаркі на аснове будаўніцтва саўгасаў, калгасаў і машына-трактарных станцый. Побач з гэтай праграмай уздыму сялянскае гаспадаркі і разгорнутай работы на сацыялістычнай перабудове вёскі пачатае ў 1930 годзе правядзеньне ўсеагульнага навучаньня пачына з 1931 годзе ахапіць дзяцей вёскі ва ўзросьце ад 8 да 11 год пачатковай школай.

У вырашэньні гэтых задач па гаспадарчым і культурным уздыме працоўных мас вёскі ў вялізарнай меры вырастае роля раёнаў, праны і адказнасьць якіх значна пашыраны ў сувязі з ліквідацыяй округ.

Забяспечыць рост прыбытку вёскі ў 1930 і 31 г.г. і прымаючы пад увагу необходнасьць умацаваньня раённых і паасобных бюджэтаў для гаспадарчага і культурнага ўздыму вёскі, а таксама пасустрат прапановам мясцовых органаў, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР, у адпаведнасьці з пастановай III сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР, пастанаўляюць:

1. Правесьці ў 1931 годзе ў вясковых паасобных адначасовы збор, які поўнасьцю паступае ў раённыя і вясковы бюджэты і выдаткоўваецца выключна на патрэ

РАШУЧА перабудаваць работу гарсавету

АЧЫСЬЦІЎШЫ МЕНГАРСАВЕТ АД АПАРТУНІСТАЎ, УЗМАЦНІЎШЫ ЯГО ЛЕПШЫМІ РАБОЧЫМІ-УДАРНІКАМІ,—ЗАБЯСЬПЕЧЫМ САВЕТАМ ПРАВ ДЗЕНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ

Справаздача гарсавету не задаволіла рабочых

Гарсавет працаваў нездавальняюча

10 студзеня рабочыя першай змены заводу «Дрэваапрацоўшчык» абгаворвалі справаздачу гарсавету, якую зрабіў тав. **Аверын.**

Дзелавой самакрытыкай былі прасякнуты спрэчкі. Рабочых не задаволіла справаздача гарсавету. Выступаўшыя ў спрэчках прызналі, што работа гарсавету адставала ад ударных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Гарсавет не завастраў увагі на пытаньні барацьбы за генэральную лінію партыі, за выкананьне прамфінпляну. Ён ня вёў барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, вялікадзяржаўным шавінізмам і нават не палічыў патрэбным таварыць аб гэтым у сваёй друкаванай справаздачы.

Многія выступаўшыя спыняліся на кіраўніцтве гарсавету работай каапэрацыі. Гарсавет не правяраў, як разьмяркоўваюцца дэфіцытныя тавары, як ідуць загатоўкі гародніны і дроў. Гэтым тлумачацца часткова прарывы, якія мелі месца ў рабочым забесьпячэньні. Гарсавет абмежаваўся толькі заслуханьнем справаздачы праўленьня ЦРК і не арганізаваў рабочага кантролю над каапэрацыяй. Гарсавет ня выканаў прапановы рабочых аб выкарыстаньні трамваяў для перавозкі грузаў.

— Нашы депутаты, — заявіў рабочы тав. **Каплан,** — за два гады ні разу не рабілі справаздач перад рабочымі і прадавалі дрэнна. Іх мы больш ня выбіраем.

Некаторыя з прамоўцаў адзначалі слабую работу па дабрабыце гораду.

Вялікім недахопам у правядзеньні сходу трэба лічыць тое, што абгаварэнь не справаздачы гарсавету ня было ўвязана з задачамі выкананьня прамфінпляну; між тым «Дрэваапрацоўшчык» ня выканаў па 12 проц. пляну ударнага кварталу.

У прынятай рэзалюцыі сход **абяцаў паспаць у гарсавет лепшых ударнікаў, якія дапамогуць перабудаваць работу гарсавету і забясьпечаць павышэньне яго ролі, як праваднік генэральнай лініі партыі.**

М. Сакалоўскі.

Гарсавет не клапаціўся аб дабрабыце

Бюро ЦК КП(б)В у сваёй пастанове па дакладу Менскага гарадзкога савету адзначыла нездавальняючую работу ў галіне дабрабыту гораду.

Вось некалькі прыкладаў, якія характарызуюць недахопы ў дабрабыце Менску.

На працягу некалькіх дзён 2 разы за зіму не курсаваў трамвай па маршруце № 2 (Менск - пасажырская — Тракаўка). У часе зазвы трамвайнае праўленьне замест таго, каб ачысьціць лінію, спыняла трамвайны рух. Часта возныя грузавікі і фурманкі займаюць лінію і трамвай прымушан прастойваць гадзінамі, чакаючы пакуль праедзе тая ці іншая фурманка. Гарсавет ня прыняў ніякіх мер, каб наладзіць нармальны рух трамваю.

Гарсавет вельмі мала зрабіў, каб палепшыць работу камунальнай механічнай пральні. Адзіная ў горадзе пральня працуе надзвычай дрэнна. Больш паловы году яна рамантуецца, бялізна мыецца па 2-3 месяцы, каб аддаваць бялізну камунальнай пральні, рабочы павінен мець некалькі тузінаў для зьмены. За апошні час у пральні зрабіліся больш частымі выпадкі абмену бялізны, пакражы яе і г. д. Ня так лёгка зараз атрымаць адны заказ. Трэба патрацiць некалькі дзён, пакуль работнікі пральні адшукаюць бялізну. Трэба паставіць пытаньне аб адкрыцьці самазлежных пральняў у жаўтках, якія (пральні) павінны вызваліць жанчыну ад хатняй работы і стымуляваць узмацненьне жанчын у вытворчасьць.

М. ВОЛЬНЫ.

Дзе няма ніякай падрыхтоўкі

Грамадзкія арганізацыі пабудовы аўтаматычнай тэлефоннай станцыі трэба рыхтоўцца да перавыбараў гарсавету. Рабочыя мала чаго ведаюць аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі, ім не растлумачана палітычнае значэньне перавыбараў. Уся падрыхтоўка па пабудове тэлефоннай станцыі зьвялася да двух агульных артыкулаў у насьценгазеце. Пытаньні аб перавыбарах не абгаворваліся ні на сходах, ні ў гутарках.

Парт'ячэйка і рабочком недаацэньваюць палітычнай важнасьці справаздачна - перавыбарчай кампаніі.

ДОРСКІ.

Лагойскі савет зрываў важнейшыя кампаніі на вёсцы

ЛАГОЙСК. (Наш. кар.). Перавыбарчая кампанія Лагойскага местачковага савету выявіла рад фактаў нўнай правапартыністычнай практыкі.

Лагойскі савет цягнуўся ў хвосьце гаспадарча - палітычных кампаній. На запытаньне — што зроблена ў галіне культурнага будаўніцтва — старшыня спакойна адказаў:

— Нічога, бо культкамісія не працавала.

—Як савет праводзіў нацпалітыку?

— Ніяк.

Ці вялася работа сярод беднаты?

— Не, бо КСУ не працаваў.

— Ці прымаў удзел савет у лесазагатоўках?

— Пакуль што не.

— Колькі абкладзена кулакоў?

— Іх у нас няма.

Падобныя адказы атрымалі выбаршчыкі на іншыя запытаньні.

Тут мы бачым самы яркі прыклад агідная бязьдзейнасьці, якая перарасла ў злосны правы апартунізм на практыцы, у сабатаваньне важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Э. Р.

Гарсавет ня прыняў мер да ліквідацыі перабояў у рабочым забесьпячэньні

Нядаўна на заводзе «Камунар» адбыўся другі справаздачны сход рабочых бляшанага цэху, чорнарабочых і служачых заводакіраўніцтва. На сход зьявілася да 85 проц. выбаршчыкаў. Амаль у поўным складзе прышлі рабочыя-бляшанікі; мала зьявілася служачых канторы.

Даклад гарсавету выклікаў жвавы спрэчкі, у якіх было завострана пытаньне наконт рабочага забесьпячэньня. Выступаўшыя таварышы падкрэсьлівалі, што з-за няўважлівых адносін гарсавету, горад адчувае вялі недахват дроў і гародніны. Замест таго, каб ужыць самыя рашучыя меры да ліквідацыі перабояў, гарсавет абмежаваўся прыняцьцем агульных пастаноў.

Трэба адзначыць, што выступаўшыя ня зьвязвалі пытаньня аб рабоце гарсавету з работай прамысловасьці, з выкананьнем прамфінпляну. Заўсюм не правёў належнай работы, каб мабілізаваць увагу рабочых «Камунара» вакол гэтага важнейшага пытаньня.

У рэзалюцыі, прынятай па дакладу, рабочыя абяцалі паспаць у гарсавет сваіх лепшых ударнікаў.

Гарсавет ня прыняў мер да ліквідацыі перабояў у рабочым забесьпячэньні

Нядаўна на заводзе «Камунар» адбыўся другі справаздачны сход рабочых бляшанага цэху, чорнарабочых і служачых заводакіраўніцтва. На сход зьявілася да 85 проц. выбаршчыкаў. Амаль у поўным складзе прышлі рабочыя-бляшанікі; мала зьявілася служачых канторы.

Даклад гарсавету выклікаў жвавы спрэчкі, у якіх было завострана пытаньне наконт рабочага забесьпячэньня. Выступаўшыя таварышы падкрэсьлівалі, што з-за няўважлівых адносін гарсавету, горад адчувае вялі недахват дроў і гародніны. Замест таго, каб ужыць самыя рашучыя меры да ліквідацыі перабояў, гарсавет абмежаваўся прыняцьцем агульных пастаноў.

Трэба адзначыць, што выступаўшыя ня зьвязвалі пытаньня аб рабоце гарсавету з работай прамысловасьці, з выкананьнем прамфінпляну. Заўсюм не правёў належнай работы, каб мабілізаваць увагу рабочых «Камунара» вакол гэтага важнейшага пытаньня.

У рэзалюцыі, прынятай па дакладу, рабочыя абяцалі паспаць у гарсавет сваіх лепшых ударнікаў.

Па Савецкай Беларусі

Навярстаць упушчанае

Леспрамгасы БССР ня выканалі пляну загатоўкі і вывазкі дроў на асобны квартал.

Паводле даных Лесбелу, ПЛЯН ЗАГАТОЎКІ ДРОЎ ВЫКАНАН У СЯРЭДНІМ НА 56,9 ПРОЦ. ПА ВЫВАЗЦЫ ДЗЕЛАВОЙ ДРАЎНІНЫ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 12,4 ПРОЦ., ПА ВЫВАЗЦЫ ДРОЎ — НА 19,6 ПРОЦ.

Поўнасьцю выканан плян загатоўкі дзелавой драўніны (101,3 проц.).

Рэкорд бязьдзейнасьці па загатоўцы і вывазцы дроў пабілі наступныя леспрамгасы: РЭЧЫЦКІ (загатоўлена 16,5 проц. пляну, вывезена — 1,8 проц.); ХОЙНІЦКІ (загатоўлена 16,1 проц., вывезена — 6,1 проц.); ТУРАЎСКІ (загатоўлена 20,4 проц., вывезена — 17,9 проц.); ВЕРАЦЕЙСКІ (загатоўлена 28,2 проц., вывезена — 11,3 проц.) і г. д.

Памерзла 16.000 кгр. бульбы

СТАРЫЯ ДАРОГІ. (Наш кар.). Брыгада рабочых лесазаводу «Пралетары» абсьледвала склады Стара - Дароскага райспажыўтаварыства. Выяўлены вялікія залежы бульбы. Звыш 16.000 кгр. бульбы памерзла і згніло. Кіраўнікі спажыўтаварыства ня прынялі своечасовых мер для пабудовы бульбахаваль-ніку. Замест таго, каб рэалізаваць бульбу сярод рабочых заводу, спажыўтаварыства хавала яе ў непрыстасаваных складах.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у гэтай злачыннай безгаспадарчасьці.

Ілюб чыгуначнікаў у Гомелі.

За дыскрэдытацыю ўлады — пазбаўленьне волі

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Выязная сэсія Жлобінскага нарсуда на працягу 2-х дзён разглядала справу старшыні Скепнянскага сельсавету Гайдука і упаважанага Жлобінскага РВК Шкірмана, якія, напіўшыся п'янымі, тэрарызавалі сялян.

Гайдук і Шкірман, нібы шукаючы бандыта, зрабілі побыскі і збілі многіх сялян.

Выязная сэсія нарсуда прыгаварыла Гайдука і Шкірмана за дыскрэдытацыю ўлады да аднаго году пазбаўленьня волі кожнага з забаронай займаць адказныя пасады ў савецкіх, прафсаюзных і інш. установах на працягу трох год.

Санаторы імя 10-ці-годзьдзя БССР будзе аздараўлены

У заметцы «Аздаравіць санаторы імя 10-годзьдзя БССР» («Зьвязда» № 5) паведамлялася аб абураючай безгаспадарчасьці, цяганіне і бюракратызьме, што пануюць у санаторыі імя 10-годзьдзя БССР (Сасноўкі). Галоўсацстрах БССР паведамляе, што УСЕ ФАКТЫ, ПАКАЗАНЫЯ У АРТЫКУЛЕ, АДПАВЯДАЮЦЬ САПРАЎДНАСЬЦІ. Галоўсацстрах прыняў меры да аздараўленьня санаторыя. У бліжэйшы час будзе зьменена кіраўніцтва санаторыя. Дырэктарам апошняга будзе назначаны рабочы-выдатнік. Абвешчаны конкурс сярод дактароў на пасаду намесьніка дырэктара санэтарыя па мэдычнай частцы.

Дырэктару санаторыя т. БРОЦКАМУ абвешчана вымова. Справа аб былым бухгальтары і двух кладаўшчыках санаторыя перададзена ў суд.

Пытаньне аб бязьдзейнасьці мясцковаму санаторыя перадана на разгляд Віцебскага раённага савету прафсаюзаў.

Пушчан бабруйскі хлебазавод

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Гэтымі днямі адбылося ўрачыстае адкрыцьцё новапабудаванага бабруйскага хлебазаводу. Завод пабудован паводле апошняга слова тэхнікі. **Пакуль што завод працуе на 4 печы і выпускае 36.800 кгр. хлеба.** Пастунова завод будзе павялічваць выпечку хлеба.

У сувязі з адкрыцьцём заводу, калектыў рабочых абвясьціў сябе ўдарным.

МЕНСК

Старт фізкультэстафэты прысьвечанай XI зьезду УсеЛКСМ.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён

Да ленінскіх дзён у музэі рэвалюцыі БССР адкрываецца выстаўка, прысьвечаная жыцьцю і дзейнасьці У. І. Леніна, падзеям 1905 году і пастановам апошніх пленумаў ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб задачах трэцяга году пяцігодкі.

Выстаўка складаецца з трох частак: першая частка — спадчына Леніна, другая — водгукі пралетарыяту і працоўных мас усяго сьвету на сьмерць Леніна і трэцяя — па ленінскім шляху.

***

Белдзяржкіно склаў сьпіс кіно-фільмаў, прысьвечаных ленінскім дням і падзеям 1905 году.

У кіно - тэатрах Менску ў ленінскія дні будуць дэманстравацца наступныя фільмы «Рэванш», «Дзьвесілы», «1905 год», «Дагнаць і перагнаць».

Канфэрэнцыі жанчын-ударніц

Прэзідыум ЦСПСВ пастанавіў правесьці ў буйных прамысловых гарадох (Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск, Барысаў, Магілеў, Рэчыца і Ворша) канфэрэнцыі жанчын-ударніц.

На канфэрэнцыях будзе абгаворана пытаньне аб выніках асобнага кварталу і задачах трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Уносім ганарар у фонд дырыжаблябудаўніцтва

Калектыў супрацоўнікаў выдавецтва «Беларуская вёска» уносіць у фонд дырыжаблябудаўніцтва ганарар, які будзе належыць за №№ «Беларускай вёскі» за 21 студзеня і «На варце» за 20 студзеня (чарговыя і спэцыяльныя нумары). Супрацоўнікі, ня маючыя ганарару, уносяць адпаведны заработак.

Выклікаем калектывы супрацоўнікаў газэт і часопісяў Беларусі зрабіць такія-ж узносы.

Калектыў супрацоўнікаў выдавецтва «Беларуская вёска».

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— Дом Камасьветы. У 19 гадз.—групавая кансультацыя для бяседчыкаў і групоргаў і культмасавага актыву — да гадавіны сьмерці Леніна.

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз.—сход членаў драматварыства па пытаньні падрыхтоўкі да друку і выданьня зборніку твораў членаў т-ва, прысьвечаных падрыхтоўцы і правядзеньню другой бальшавіцкай вясны.

— ВАН. 12-і да нам. дырэктара інстытуту асьпірантуры ВАН т. Усьпенскага (пакой № 32) выклікаюцца: асьпіранты-хэмікі і іх кіраўнікі ў 14 гадз., асьпіранты біялёгіі ў 14 з пал. гадз., батанікі — у 15 гадз., фізыкі — у 15 з палов. гадз., матэматыкі — у 16 гадз.

— Навуковая асацыяцыя дактароў. У 20 гадз. у нам. ін-ту сан. гігіены—агульны сход гігіенічнай секцыі навуковай асацыяцыі дактароў пры ЦП саюзу МСП.

ПК ЦКК КП(б)Б даводзіць да ведама т. т., якія апялююць на пастановы ЦКК КП(б)Б, што выязная тройка ЦКК УсеКП(б) пачне сваю працу па разгляду партспраў з 13-і 1931 г. у г. Менску.

Разгляд партспраў будзе праводзіцца наступным парадкам:

На 24-і—31 г., у 10 гадз. ран: Бабіч П. Т., Бораш Ц. С., Астапенка Ц. А., Навіцкі А. П. (Рэчыцк. арг.), Гарашчанка Я. М., Гірасімаў М. М., Цырлін Л. А. (Гомельск. арг.), Кужеш Р. Ф., Маеевіч В. А. (Менск. арг.), Шэйнман І. І., Шэйнман І. П. (Магілёв. арг.), Фелдасеў Я. А. (Барысаўск. арг.), Раўнейка Н. С. (Заслаўск. арг.), Маркін В. С. (Бабруйск. арг.), Русіновіч П. Я. (Парыцк. арг.).

На 22-і—31 г., у 10 гадз. ран.: Станкэўскі К. М. (Асіпавіцк. арг.), Галкін Е. Ф., Дворкін Я. М., Сьняжкоў А. А., Малева М. М. (Гомельск. арг.), Вураковў М. Я. (Рэчыцк. арг.), Дубпель Д. А. (Ветрынск. арг.), Цузакевіч В. Я. (Жлобінск. арг.), Радкевіч Я. С., Худавец П. А., Магідаў А. С. (Бабруйск. арг.), Шырасў А. М. (Слуцк. арг.), Гранчык Р. А. (Чэрвеньск. арг.), Давыдовіч Д. Я. (Вярэйск арг.), Корба С. Р. (Уваравіцк. арг.).

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-81
Сэктар інфармацыі	6-10	Аддзел падпіскі	7-31
		„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі (з дармовым дадаткам „Пра фрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі: За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—сьніжна. Звычэ тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх, тэл. 7-31.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ГАЗЭТУ „РАБСЕЛЬКОР"

Орган культпропу ЦК КП(б)Б, выданьне газэты «ЗЬВЯЗДА».

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА—20 кап. на 1 месяц. ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі п.-т. канторамі.

Беларуск Другі Дзяржаўны тэатр

Сёньня, 12 студзеня—спэктакль для Харчавікоў

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

Пачатак у 8 гадз. веч.

КІНО „Юны Піянэр"

З понядзелка, 12 студзеня апошняя сэрыя „ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВ ЛЯТА"

Кіно-аповесьць у 6 ч. Штодзень 3 сэансы

Пачатак: 1 гадз. 2 гадз. і 3 гадз. дня

Каса адкрыта з 12 г. дня.

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ і дакуманту 1 р.

Кіно „СПАРТАК"

З панядзелка, 12 студзеня

Зьвыш праграмы гастролі артыста ленінградзкіх тэатраў С. М. Волжына

У РЭПЕРТУАРЫ: апавяданьні, гумар, музыка, жарты.

На зрыве, з прычыны посьпеху 2-гі тыдзень ПАЛАЧЫ

у 7 частках з правёгам.

Пачатак сэансаў: 7, 9, 11 гадз. дня 3 і 5 гадз.

Праўленьне менскай арцелі крэйцоў «ПРАЛЕТАРЫ»

(Ленінская, 20, тэл. № 7-79)

паведамляе ўсе прадпрыемствы і установы, што арцелі прымаюцца ўсякія буйныя заказы з матар'ялу заказчыка

па наступных цэхах: мужчынскім, жаночым, плацьцяным, спэцвопратцы, скураных куртак, бялізны, дзіцячых, зонтаў, шапак і шэйных і рукавіцкім.

У панядзелак, 12 студзеня, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні 2-ой школы (супроць пошты)

адбудзецца

ЗБОР АВІЯХІМАТРАДАЎ

Фрунзаўскага і Кастрычніцкага раёнаў.

Яўка ў форме абавязковая.

СЁНЬНЯ ў доме Працоўнасьці (Камуністычная вул.) у 6 гадз. веч. скліканецца

ПЕРШАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ АСОАВІЯХІМУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Праца ЦС Асоавіяхіму БССР і задачы таварыства (Дакл. тав. ДРЫЛЁНКА).

2) Задачы Менскай гарадзкой арганізацыі Асоавіяхіму на 1931 г. (Дакл. т. НАВАСЁЛАЎ).

3) Выбары гарсавету, рэвіз. камісіі і дэлегатаў па 2-гі Усебеларускі зьезд Асоавіяхіму.

Мандаты выдаюцца з 9-га студзеня з 11 гадз. раніцы да 7 гадз. веч. у памяшканьні Райсавету, вул. Энгельса, 24, 1-шы паверх.

Для атрыманьня мандатаў усім ячэйкам прадставіць выпіскі з пратаколаў.

1-я МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ СВБ

15 студзеня, у 7 гадз. веч., у клюбе імя 18 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі (6 чыгуначная царква) адбудзецца першая менская гарадзкая канфэрэнцыя саюзу вайўнічых бязбожнікаў.

Парадак дня: 1) Чарговыя задачы антырэлігійнай прапаганды. 2) Выбары гарсавету і ревізійнай камісіі.

Мандаты выдаюцца з 11 г. раніцы да 3 г. дня і ад 6 да 8 г. веч. у райсавеце СВБ. Францыя канфэрэнцыі адбудзецца 14 студзеня у 7 г. в., у доме Камасьветы, пачэй райсавету СВБ.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя Карла Маркса

Дом Камасьветы разам з сакцыяй навуковых прапаўнікоў наладжвае 13-і, а 7 а пал. гадз. веч. вялікі дыспут на тэму:

„РЭЛІГІЯ І НАВУКА"

(да вынікаў дыскусіі сярод навуковых прапаўнік.)

Уст упшае слова праф. Вальфсона.

Удзельнічаюць: т.т. Арнацкі, Валабрынскі, Галанва, Гнуў, Крыніцкі. Білеты на арганізацыях і ў чытальні дому.

Запрашаюцца прадстаўнікі друку.

Усім ФЗМК, групкомам і загадчыкам клюбаў г. Менску.

Скліканьня культсэктарам ЦСПСБ на 4 студзеня нарада арганізатараў культработы ФЗМК, ГК і заг. клюбаў

на пытаньні нац. работы і інтэрнацыянальнага выхаваньня, на яе ФЗМК, ГК і клюбаў была сарвана.

Культсэктар ЦСПСБ, лічачы падобныя зьявішчы недапушчальнымі прапануе ФЗМК, ГК і праўленьням клюбаў прыняць заходы да своечасовага паведамленьня арганізатарам аб перанясеньні нарады на СЁНЬНЯ у 6 гадз. веч., у залі ЦСПСБ.

ЦК саюзу, ФЗМК, ГК і праўленьням клюбаў прапанавана ня явіцца.

Культсэктар ЦСПСБ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" З панядзелка, 12 студзеня

лепшы фільм сэзону з эпохі грамадзянскай вайны

ТАБЕ ДАРУ

Драма ў 6 разьдзелах.

Рэжысэр В. РАДЫШ.

Разьдз. 1. Сотнік Галіна. 2. Па конях. 3. Адзай твой кулямёт. 4. Здрадзіў рэвалюцыі. 5. «Сом-м-кинсь». 6. Табе дару.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Сотнік Галіна—АКСАНА ПАДЛЕСНАЯ (Вядомая па карціне «ВЕЦЕР»)

Стары Данько—С. ШАГАЙДА

Яго сын—Лёўка—М. ІСІПЕНКА

Асадчы—В. КРАСЕНКА

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-хроніка „САЮЗКІНО" № 64

Адкрыцьцё савецка-кітайскай канфэрэнцыі

Пачатак сэансаў: у 7, 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

Каса—з 5 гадз. веч.

Тыя, хто спозьніцца, на сэанс не дапускаюцца.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

З панядзелка, 12 студзеня

амэрыканскі прыгодніцкі фільм

ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

ДЖЭК МАРЛОЎ, ХЭГ АЛЬЛЕН, ВІЛЬЯМ РЭЛЬЛЕЙ.

Штодзенна 4 сэансы. Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 м.

Каса адкрыта з 4 з пал. гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА

Цікавы фільм паводле вядомага апавяданьня Шолам-Алейхэма

Яўрэйскае шчасьце

У ГАЛОЎНАЙ РОЛІ ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ РЭСПУБЛІКІ МІХАЭЛЬС.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ЧАСОПІСЬ „САЮЗКІНО" № 63.

МЯСНЯ. На вечары рабочых ф-кі „Московшвей № 5", які прысьвечаны дню ударніка.

1. І. Камакова паведамляе пра залічэньне ў партыю 6 ударніц фабрыкі.

2. Гладзілка з цэх кацінаўні ўступіў у партыю.

3. Лепшыя ударніцы прэміруюцца.

Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.)—(Каса—з 4 гадз. 30 м.

Усебеларуская Кантора Дзяржбанку

даводзіць да ведама усей клікатуры гор. Менску, што з прычыны пераезду Банку ў НОВАЕ ПАМЯШКАНЬНЕ (рог Савецкай і Ленінскай)

БАНК 13 СТУДЗЕНЯ БУДЗЕ АДКРЫТ да 12 г. 14 СТУДЗЕНЯ БУДЗЕ ЗАКРЫТ

Аперацыі будуць вытвярацца выключна казначэйскай (першы паверх, стары будынак)—прыём налёўных грошай і выдача на зарплату, а таксама прыём дзённай і вячэрняй выручкі ад МЦРК.

13 студзеня усе аперацыі будуць вытвярацца у новым памяшканьні.

ДЗЯРЖБАНК.

Полацкі сельска-будаўнічы тэхнікум

(дзярганізаваны з б. прафшколы агнятрызлага будаўніцтва)

абвяшчае студзеньскі прыём 60-ці асоб на першы КУРС.

Сельбудтэхнікум мае мэтай рыхтаваць спэцыялістаў тэхнікаў сярэдняй кваліфікацыі для будаўніцтва ў сельскіх мясцовасьцях (саўгасах і калгасах).

У тэхнікум прымаюцца асобы, адпавядаючыя ніжэй пералічным умовам:

1) Узрост ня менш 16-18 г., незалежна ад полу, дасягнуўшы 18 гол.

2) Па асьвеце—скончыўшыя сямігодкі. Асобы, якія скончылі рабфакі, двухгодкі, курсы па падрыхтоўцы рабочых у ВТНУ і тэхнікумы, ВНКМ прымаюцца ў першую чаргу і без іспытаў. Без іспытаў прымаюцца таксама і скончыўшыя сямігодку у 1929-30 г.

Прыём заяў праводзіцца з 7-га па 25-га студзеня 1931 г. Асобы, якія жадаюць паступіць у тэхнікум, падаюць заявы з прыкладаньнем наступных дакументаў: а) Арыгінал пасьведчаньня аб асьвеце. б) Дакументы аб сацыяльным становішчы. в) Даведку аб вытворчым стажы паступаючага і яго бацькоў. Даведку аб непазбаўленьні выборных праў паступаючага і яго бацькоў (для сялян, апрача гэтага падатковы ліст за 1929-30 г.). г) Пасьведчаньне аб вараджэньні. д) Арыгінал дакументу аб адносінах да вайсковай павінасьці. е) Пасьведчаньне ад дзяржлекараў установы аб стане здароўя. ж) Дзьве пасьведчаньні фатаграфічныя карткі з подпісам паступаючага.

Увага: Пры перасылцы па пошце патрэбна прыкладаць дзьве 10-ці кап. маркі для адказу.

Тэрмін іспытаў і залічэньня ад 25-га да 30 студзеня. Пачатак заняткаў 1-га лютага 1931 году.

Залічаныя ў тэхнікум асобы, якія ня прыступяць да заняткаў на працягу дакладу са дня пачатку навучаньня, выключаюцца са сьпісаў студэнтаў тэхнікуму і іх месцы запаўняюцца кандыдатамі.

55 проц. усіх студэнтаў тэхнікуму будуць забясьпечаны стыпендыямі і інтэрнатамі.

Адрас тэхнікуму: гор. Полацак, Ленінская, 48, Полацкі сельска-будаўнічы тэхнікум.

Дырэктар Сельска Будаўнічага тэхнікуму Азірэй.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ЛЮТЫ і далейшыя месяцы 1931 г. —) НА ГАЗЭТУ (— „ЗЬВЯЗДА"

Газэта „ЗЬВЯЗДА" з 1-і-1931 г. ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА ва ўсе дні тыдню

Падпісная цана—1 р. у мес.

Падпіска прымаецца ўсюды на ПОШЦЕ

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Блажэвіча І. Ф., 3431; мэтр. вып. Блажэвіча Я. І., 3432; мэтр. вып. Блажэвіча Ф. І., 3433; вайск. біл. Слуцк. ваенк. Пейкер Э. М., 3434; каап. кн. № 942/341 Кіпулі А. К., 3435; вайск. біл. Самахв. РВК, кон.-вуч. карт. Самахв. РВК Ляўко К. Ф., 3436-3437; пашп. Мен. міл. Быхаўскай В Л., 3438; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Хмыз Т. М., 3439; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Хмыз В. Я., 3440; дав. аб выб. пр. Навадь. с/с Шыманскай Е. Б., 3441; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Шыманскага А. А., 3442; дав. МК хат. прац. Шыманскай А. А., 3443; пашп. Мен. міл. Клімовіч П. В., 3444; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Бакіноўскай М. Б., 3445; чл. біл. с. буд. Павідайка І. М., 3446; парт. біл. Мен. АК КП(б)В, чл. біл. с. мэтал., вайск. біл. Мен. ваенк. Нядзьведзкага Р. А., 3447-3449; чл. біл. с. сувязі № 82038 Шымчонка А. Н., 3450; чл. біл. с. мэтал. Ніблоўскага О. Ф., 3451; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Іванова Я. Ц., 3452; пасьв ас. Канст. міл., вайсков. біл. Канст. ваенк. Кісяленіча Я. В., 3453-3454; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Рубін Х., 3455; пашп. Мен. міл., дав. аб пр. гол. Мен. міл. Осіпскай Ф. Ф., 3456-3457; вайск. біл. Парафл. РВК. Ханлана Я. С., 3458; пашп. Бярэз.-РВК Власюка П. Л., 3459; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Азаронка Р. Ц., 3460; пасьв. Мен. ПТШ Шкілевіча Ф. А., 3461; каап. кн. Койд. спаж. т-ва Шчасьлёнка А. І., 3462; чл. біл. с. СГС, ас. пасьв. к-ры «ГЭТ» Тунка Б. Я., 3463-3464; парт. біл. № 83880 Бранск. АК УсеКП(б), студ. біл. вамбузу Салаўева У. Я., 3465-3466; чл. біл. с. друк. № 00146515 Рубінштэйна З. Л., 3467; чл. біл. с. працасьв. № 411 Гулеса У. П., 3467; вайск. біл. № 1152/1112 Кіўсук. РВК Альтшулера В. М., 3468; разьл. кн. арт. «Чырв. Абутнік» Дукорскага Я. Я., 3469; ордэр на кв. Жылст. Вашкевіча І. М., 3470; пашп. Мен. міл. № 12693 Рэжэцкай Г. Д., 3471; чл. біл. с. СГР № 62153 Шісчак М., 3472; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Дзяткі М. Я., 3473; чл. біл. с. СГС Крупскай А. С., 3474; дав. аб маем. калгасу «Чырв. Партыз.» Кандрацкай В. П., 3475; парт. біл. № 1105900 Мен. АК КП(б)В Кіянава С. А., 3476; вайск. біл. Вабр. ваенк., чл. біл. с. друк. Кавакевіча С. Л., 3477-3479; мэтр. вып. Астр.-Гарадз. міл. Дзадушы М. Я., 3479; парт. біл. Мен. АК КП(б)В № 0814557; вайск. біл. Мен. ваенк. Вялок М. П., 3480-3481; ашчад. кн. Койд. крэд. т-ва «Сілаз» калг. імя Мархлеўскага, 3482; чл. біл. с. нархарч. жэк. кв. Мен. страхк. Зіганчык М. К., 3483-3484; дав. аб пр. гол. Шарш. с/с Стасіляніча Я. А., 3485; дав. аб пр. гол. Шарш. с/с Сталіеніча Ю. К., 3487; вайск. біл. Капыл. РВК Райзіна Д. А., 3487; каап. кн. Засл. спаж. т-ва Загаловіча С. І., 3488; мэтр. вып. Самахв. міл. Шарко Л. М., 3489; мэтр. вып. Самахв. міл. Ярашэвіч Е. І., 3490; вайск. біл. Мен. ваенк., каап. кн. Лаг. спаж. т-ва, партыв. паскв. АДПУ, кон. кн. Лаг. РВК Камінскага М. А., 3492-3493.